

ГУРТОК ПА АВІЯМАДЭЛЯВАННІ

ЧЫРВОНКА



НАВОШТА ЛІТВЕ СТОЛЬКІ ЗБРОІ?

13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

6 ЧЭРВЕНЯ 2024 г. ЧАЦВЕР № 109 (30243)

## КОРАТКА

• **Прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка правёў пасяджэнне Рэспубліканскага аргкамітэта па падрыхтоўцы і правядзенні святкавання 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.**

• ААТ «Крычаўцэментнашыфер», адно з прадпрыемстваў холдынга «Беларуская цэментная кампанія», выпусціла 15 млн тон цэменту з моманту пуску новай тэхналагічнай лініі па вытворчасці цэменту «сухім спосабам».

• **ДПК: уезду ў ЕС чакае больш за 2,7 тыс. грузавікоў.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір КРЭЧ, намеснік міністралясной гаспадаркі:**

*«Попыт на драўляныя домакамплекты ад лясгасаў з пачатку года вырас больш як у 4 разы. Калі за ўвесь мінулы год мы рэалізавалі фізічным асобам 10 домакамплектаў, то за 5 месяцаў гэтага года — ужо 16, яшчэ 27 цяпер знаходзяцца ў стадыі вырабу, гэта значыць, пакупнікі заключылі дагаворы і ўнеслі перадаплату. Аб'ём рэалізацыі круглых лесаматэрыялаў за 5 месяцаў вырас на 600 тыс. куб. м у параўнанні з аналагічным леташнім перыядам і склаў з пачатку года амаль 4 млн куб. м. Дынаміка рэалізацыі драўніны на ўнутраным рынку дадатная. Што вельмі важна: мы бачым рост попыту з боку перапрацоўшчыкаў на тую прадукцыю, якая раней была не надта запатрабавана».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «МЫ ХОЧАМ БЫЦЬ УМАНЦІРАВАНЫ Ў ВАШЫ ПРАЦЭСЫ ПА ВЫСОКІХ ТЭХНАЛОГІЯХ»

## На чым рабіў акцэнт Прэзідэнт падчас візіту ў Іркуцкую вобласць

**Пабываць у Іркуцку і не з'ездзіць на Байкал проста немагчыма. Самае глыбокае возера свету з яго ўнікальнай прыродай знаходзіцца зусім недалёка ад абласнога цэнтра. Не дзіўна, што візіт Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў Іркуцкую вобласць пачаўся менавіта з Байкала. Разам з губернатарам Іркуцкай вобласці Ігарам Кобзевым і паўнамоцным прадстаўніком Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі ў Сібірскай федэральнай акрузе Анатолем Серышавым кіраўнік дзяржавы зрабіў прагулку на караблі ўздоўж Кругабайкальскай чыгункі. Прэзідэнт прызнаваўся, што пабываць у гэтых дзівосных мясцінах было яго даўнім жаданнем, раіў яму прыехаць сюды і расійскі кіраўнік Уладзімір Пуцін.**

**Але, вядома ж, не толькі імкненне паглядзець на ўнікальныя мясціны было мэтай візіту кіраўніка нашай дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка правёў у Іркуцку важныя сустрэчы, якія дадуць яшчэ адзін значны імпульс развіццю супрацоўніцтва Беларусі і гэтага багатага расійскага рэгіёна.**



Фота БелТА.

Рэгіён, дарэчы, далёкі ад нас геаграфічна, але вельмі блізкі духоўна. Аб гэтым сведчыць і сустрэча, якую зладзілі Прэзідэнту Беларусі каля будынка Урада Іркуцкай вобласці, — з хлебам-соллю і народнымі песнямі. Разам з губернатарам да Аляксандра Лукашэнкі выйшлі ветэраны вайны і працы, артысты фальклорнага ансамбля Іркуцкага таварыства беларускай культуры і народнага фальклорнага ансамбля «Абярэг» Іркуцкага абласнога Дома народнай творчасці.

А губернатар Ігар Кобзеў падзякаваў Аляксандру Лукашэнку, што той стрымаў сваё слова. У верасні 2020 года Ігар Кобзеў наведваў з рабочым візітам Беларусь і наш Прэзідэнт паабяцаў прыехаць на Байкал. Кіраўнік вобласці праінфармаваў Прэзідэнта Беларусі аб магчымасцях рэгіёна і яго прамысловым патэнцыяле. Ён спыніўся на эканоміцы вобласці і расказаў аб рэалізацыі найбуйнейшых інвестыцыйных праектаў.

«Нам сёння патрэбна і неабходна прысутнасць нашых братоў, калег і партнёраў. Мы заўсёды адкрыты», — сказаў губернатар.

СТАР. 2

Актуальнае інтэрв'ю

**Андрэй ІВАНЕЦ:**

# «КАЛІ ГАВОРКА ІДЗЕ ПРА БУДУЧЫНЮ КРАІНЫ, ДРОБЯЗЯЎ БЫЦЬ НЕ МОЖА»



**Аб'яўлены Годам якасці, 2024-ы ў многім вызначыў прыярытэты далейшага развіцця ўсіх сфер жыццядзейнасці нашага грамадства: ад эканомікі да якасці жыцця. І сфера адукацыі ў гэтым пераліку — адна з найважнейшых, бо гаворка ідзе аб маладым пакаленні беларусаў, іх сённяшнім і заўтрашнім дні — а значыць, і аб будучыні нашай краіны. Таму ў сваёй штодзённай дзейнасці Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь задачай нумар адзін вызначае павышэнне якасці адукацыі, прычым як у працэсе навучання, так і ў аспекце выхаваўчым. Адсюль вынікаюць усе тыя захады, якія былі прыняты, апрабаваны і ў далейшым укаранёны ў айчынную сістэму адукацыі на працягу некалькіх апошніх гадоў. Што гэта за мерапрыемствы і як яны ўплываюць на далейшае развіццё адукацыі ў краіне, чытачам расказвае міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь Андрэй ІВАНЕЦ.**

СТАР. 4–5

Падзея

# ПОГЛЯД У ЗАЎТРА

## Міжнародны форум па інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогіях «ТІБА-2024» адкрыўся ў Мінску

**Асноўная тэматыка «ТІБА-2024» — забеспячэнне кібербяспекі і ўмацаванне тэхналагічнага суверэнітэту нашай краіны, гаворыца ў прывітанні кіраўніка дзяржавы ўдзельнікам і гасцям XXX Міжнароднага форуму па інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогіях, якое агучыў першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім РЫЖАНКОЎ.**

СТАР. 5




Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на ІІІ квартал і ІІ паўгоддзе 2024 года

Мы абяцаем нясумны час з любімай газетай.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# «МЫ ХОЧАМ БЫЦЬ УМАНЦІРАВАНЫ Ў ВАШЫ ПРАЦЭСЫ ПА ВЫСОКІХ ТЭХНАЛОГІЯХ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Пасля сустрэчы з Ігарам Кобзевым Аляксандр Лукашэнка пагутарыў з мясцовымі жыхарамі: гараджане сабраліся каля ганка і чакалі Прэзідэнта Беларусі. Як аказалася, у многіх з іх сваякі пражываюць у нашай краіне. «Прыязджайце часцей», — папрасілі іркуцяне, робячы памятныя фатаграфіі з беларускім лідарам.

Затым кіраўнік дзяржавы накіраваўся на Іркуцкі авіяцыйны завод.

Як вядома, Беларусь і Расія асаблівую ўвагу ўдзяляюць развіццю ўласнага авіябудавання. Перад расійскай авіябудаўнічай галіной стаіць задача рэалізаваць маштабныя праекты па нарошчванні аб'ёмаў выпуску суднаў грамадзянскай авіяцыі. Прадпрыемствы Беларусі даўно падключыліся да рэалізацыі гэтай задачы, яны дапамагаюць з пастаўкамі авіяцыйных кампанентаў, вузлоў і агрэгатаў.

На заводзе кіраўнік дзяржавы азнаёміўся з этапамі вытворчасці ваеннай авіяцыйнай тэхнікі (тут, дарэчы, робяць самалёты і для беларускіх Ваенна-паветраных сіл), зборкі пасажырскага лайнера МС-21. Кіраўніцтва прадпрыемства падрабязна праінфармавала Прэзідэнта Беларусі аб прадукцыі, што выпускаецца, і перспектыўных распрацоўках.

Іркуцкі авіяцыйны завод нацэлены на пашырэнне вытворчай кааперацыі з авіяцыйнымі прадпрыемствамі Беларусі. Таму тэма рэалізацыі сумесных праектаў, напрыклад у станкабудаванні і мікраэлектроніцы, стала асноўнай у час візіту кіраўніка дзяржавы.



Фота БелТА.

«Яны хочуць на базе Беларусі гэта рабіць — трэба брацца і рабіць», — падтрымаў Аляксандр Лукашэнка развіццё кааперацыйных сувязяў.

Перш за ўсё размова ідзе аб распрацоўцы пасажырскіх і транспартных тэхналогій. Беларусы ўжо дапамагаюць расійскім партнёрам, пастаўляючы камплектуючыя, рамантуючы і мадэрнізуючы авіяцыйную тэхніку, але перспектывы значна шырэйшыя. Прэзідэнт Беларусі прапанаваў кіраўніцтву прадпрыемства вызначыць новыя нішы і, не адкладваючы на потым, пачынаць работу.

«Мне трэба найноўшыя тэхналогіі, г. зн. мы хочам быць уманціраваны ў вашы працэсы па высокіх тэхналогіях. І гэта павінна быць наша агульнае — Беларусь і Расія не павінны дзяліць. Як мы часта гаворым, тавар Саюзнай дзяржавы. Давайце ўраўнуем у правах беларускія і расійскія тавары, каб не было ніякіх праблем. І тады знікнуць размовы, хто каго паглынае і аб'ядноўвае. Эканоміка ўсё паглыне», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

На заводзе Аляксандру Лукашэнку падарылі мадэль знішчальніка Су-30.

Аб'яднаная авіябудаўнічая карпарацыя рэалізоўвае праграму імпартазамяшчэння і нарошчвання тэмпаў вытворчасці. У сувязі з гэтым развіццё супрацоўніцтва з прадпрыемствамі Беларусі набывае найважнейшае значэнне.

«Плануецца наладзіць больш цеснае ўзаемадзеянне з беларускімі вытворцамі, у тым ліку па нарошчванні аб'ёму паставак авіяцыйных кампанентаў, вузлоў і агрэгатаў», — расказалі журналістам на заводзе.

**Паводле БелТА.**

### У тэму

«У нас з Іркуцкай вобласцю ў апошнія два гады вельмі інтэнсіўна развіваецца супрацоўніцтва. Па нашым экспарце ў рэгіён мы вярнуліся на даковідны ўзровень. Тым не менш Прэзідэнт сказаў, што гэта вельмі мала і трэба павялічваць абароты ў 2-3 разы», — расказаў журналістам пасол Беларусі ў Расіі Дзмітрый Крутой.

Тавараабарот прадпрыемстваў сістэмы Мінпрама з арганізацыямі Іркуцкай вобласці па выніках 2023 года склаў $16,3 млн. Па харчовых таварах і сельгассыравіне тавараабарот за год склаў $3,2 млн.



Фота БелТА.

Па сутнасці

# СЛОВА, У ЯКІМ ЖЫВЕ ДУША



**Фронт, супрацьстаянне, атакі. Пра што гэта? Пра журналістыку. Кажуць, словам чалавека можна забіць. Так. Калі казаць пра эмацыянальную сферу. Словы дзейнічаюць нават на арганізм чалавека. А калі казаць пра інфармацыйную вайну — у якім эквіваленце гэта магчыма вымераць? І ці магчыма? Колькі тых Хірасім і Нагасакі загінула ў медыйным супрацьборстве? Хто падлічыць? Хаця пачакайце. Такую «арыфметыку» магчыма правесці. Асабліва калі ўзяць за пункт адліку распад СССР. На былой постсавецкай прасторы скрадзеныя пакаленні, ідэалы, спрабуюць нават адабраць у нас Перамогу. І сёння гэты працэс не спыняецца.**

А цяпер страты ў лічбах і канкрэтных межах. Дзясяткі мяцежоў і каляровых рэвалюцый, што знішчылі краіны і грамадскі ўклад. Краіны Прыбалтыкі і Украіна, якія адарвалі ад родных берагоў. І ўсё пачыналася са слова, кадра, кнігі, фільма — з інфармацыі. Сёння інфармацыя стала элементам маніпулявання і вайны. Прычым калі не ведаць, то і не заўважыш, што асобны брудны фэйк і чарговы «фільм» — не проста адзінкавыя моманты, а звязаныя павуціннем факты інфармацыйнай вайны. А калі паглядзець глыбей, то відавочна, што Галівуд, і цэнтры псіхалагічнага ўздзеяння, і нават «Еўрабачанне» — баявыя аперацыі калектыўнага Захаду супраць шматлікіх краін свету.

Як супрацьстаяць у гэтай вайне? Ёсць разуменне, што павінны быць выпрацаваны ўласныя тэхналогіі і свая стратэгія. Мазгавы штурм, які вырашае гэтыя пытанні, — медыйны форум. Журналісты, ідэолагі, блогеры — усе, хто працуе са словам і грамадскім меркаваннем, — сабраліся ўжо чацвёрты раз, цяпер у Магілёве. На сустрэчу запрасілі Прэзідэнта. Атрымалася вельмі аб'ёмнае мерапрыемства. Мазгавы штурм, сустрэча аднадумцаў, вялікая шчырая размова.

На інфармацыйнай вайне, як і звычайнай, пастаянна мяняюцца тэхналогіі. Як ім супрацьдзейнічаць і чаго не хапае сучаснай журналістыцы? Лайфхакі і стратэгію развіцця прапанаваў Прэзідэнт. Перш за ўсё трэба зберагчы сваю медыйную незалежнасць. Толькі так можна адказаць на ўздзеянне так званай «мяккай» сілы.

То быў шчыры дыялог. Кіраўнік дзяржавы прызнаўся, што да 2020 года не ў поўную меру ацэньваў ролю медыя. Але яшчэ да спробы дзяржперавароту здарыўся ковід. Аляксандр Лукашэнка настойваў на сваім шляху падчас пандэміі. І час паказаў правільнасць выбару. Але цяпер мала правільна дзейнічаць, трэба яшчэ папулярна растлумачыць. Бо рэчаіснасць людзі ацэньваюць праз экран гаджэта. Менавіта экран у 5-7 цаляў стаў і акном у свет, і акном Овертана для любой заморскай ідэалагемы.

З людзьмі журналісты павінны весці пастаянны дыялог. А каб слухалі і чулі, трэба прытрымлівацца праўды і паважлівых адносін. У 2020 годзе ў медыяполі ўзнікла новая тэндэнцыя — журналістыка радыкальнага слова. Але для ўсяго свой час. І цяпер замест ваяўнічасці грамадства чакае прымірэння. Беларуская дзяржава — не пра вайну, мы за мір, кансалідацыю ўнутры краіны і дыялог з іншымі дзяржавамі. Вось новыя наратывы для беларускіх медыя.

Яшчэ адна парада для рэгіянальнай прэсы — быць смялейшымі. Прэса павінна заваяваць давер і аўтарытэт у чытача. Не толькі крытыкаваць, але і прапаноўваць, тлумачыць. Весці дыялог. Апаненты нашай дзяржаўнасці свае намаганні накіравалі на рэгіёны. Маўляў, там людзям больш баліць дрэнная дарога, а не геапалітыка. Ды і сталіца, як больш актыўная, больш атрымлівае ўвагі да сябе. А правінцыя спакойная, яе і намагаюцца разгайдаць. Ды там і чыноўнікі больш павольныя, і сувязі паміж роднымі больш цесныя, і фінансаванне меншае. Так што рыхтуемся да супрацьдзеяння атакам. Прафесійным і метадычным.

Яшчэ адна асаблівасць — ваяўнічая журналістыка, якая гарантуе рэйтынгі, але да душы можа дастукацца толькі словам, у якім жыве душа. На гэта Прэзідэнт і арыентуе старажылаў ды маладых журналістаў. Бо мы краіна не авіяносцаў, а буслоў. А каб захапіць патрабавальнага чытача і гледача ва ўмовах канкурэнцыі з усюдыіснымі блогерамі, трэба сапраўды мець талент. Злы геній — кароткі шлях да поспеху, але толькі душэўная журналістыка — гэта пра спрадвечнасць. Нашы словы павінны быць не кулямі інфармацыйнай вайны, а гаючымі зёлкамі, якімі можна супакоіць разварэджаныя думкі і пачуцці. Але сітуацыі і задачы могуць змяніцца, як у 2020 годзе, за некалькі гадзін. І да гэтага трэба быць гатовымі. На вайне як на вайне.

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Брусэлі фермеры арганізавалі маштабную акцыю пратэсту



Напярэдадні выбараў у Еўрапарламент, якія пройдуць 6—9 чэрвеня, фермеры зноў арганізавалі акцыю пратэсту, паведаміла ТАСС. У ёй удзельнічалі фермеры з Бельгіі, Германіі, Нідэрландаў, Польшчы і Румыніі, былі задзейнічаны больш за 200 трактароў. Арганізатарамі акцыі выступілі еўрапейская арганізацыя «Сілы абароны фермераў» і некалькі грамадскіх арганізацый, у тым ліку бельгійскі «Грамадзянскі рух». «Брусель разбурае высакаякасную еўрапейскую сельскую гаспадарку. Адной рукой яны ставяць нам невыканальныя экалагічныя патрабаванні, а другой — імпартуюць прадукты замежных вытворцаў, якія таннейшыя, паколькі ў іх падобных патрабаванняў няма. Гэта бездаказна і злачынна, і гэта прывядзе да гібелі сельскагаспадарчай вытворчасці ў Еўропе, калі мы іх не спынім», — заявіў адзін з удзельнікаў акцыі.

### Прэзідэнт Аргенціны мае намер прымяніць штучны інтэлект для рэформы дзяржкіравання

Хаўер Мілей заявіў журналістам аб намеры прымяніць штучны інтэлект для правядзення рэформы дзяржаўнага кіравання, паведаміла ТАСС. Выступаючы ва ўрадзе, Прэзідэнт Аргенціны распавёў аб тым, што цяпер вырашаецца, якой будзе наступная дзяржаўная рэформа. «Дзяржава павінна стаць больш эфектыўнай. Мы паразмаўлялі з людзьмі з Google, у іх ёсць модуль для правядзення рэформы дзяржавы, але пры дапамозе штучнага інтэлекту. Так што мы будзем рухацца ў гэтым напрамку», — абазначыў ён. Раней прэзідэнт Аргенціны падчас наведвання ЗША правёў сустрэчы з кіраўніцтвам шэрагу карпарацый. Таксама ён абмеркаваў магчымасць інвеставання з прадстаўнікамі 30 кампаній, якія працуюць у сферы штучнага інтэлекту.




### У Вялікабрытаніі выпусцілі ў абарачэнне банкноты з Карлам ІІІ



Новыя банкноты паступова, павольна будуць замяняць у абароце цяперашнія, з партрэтам памерлай у верасні 2022 года каралевы Лізаветы ІІ — па меры іх зносу, а зносіцца яны няхутка, таму што зроблены з гнуткага пластыку, паведаміла «Бі-бі-сі». Карл ІІІ стаў усяго другім брытанскім манархам, чый партрэт з'явіўся на банкнотах. Упершыню партрэт манарха пачалі друкаваць на папяровых фунтах у 1960 годзе, і тады на троне была Лізавета — яна да таго часуваладарыла ўжо восем гадоў. «Гэта гістарычны момант: мы ўпершыню мяняем партрэт суверэна на нашых банкнотах», — сказаў кіраўнік Банка Англіі Эндру Бейлі. На адваротным баку купюр засталіся ранейшыя асобы: на пяці фунтах — Уінстан Чэрчыль, на дзесяці — пісьменніца Джэйн Осцін, на дваццаці — мастак Джозэф Тэрнер, на пяцідзесяці — матэматык Алан Цьюрынг. Некалькі банкаў Шатландыі і Паўночнай Ірландыі па дамове з Банкам Англіі выпускаюць уласныя шатландскія і ірландскія фунты, і на іх банкнотах ні манарха, ні гэтых знакамітых англічан няма.

На кантролі

# «ЗЯМЛЯ ДЛЯ НАС — ГАЛОЎНЫ РЭСУРС»

## У Любані пад кіраўніцтвам Наталлі КАЧАНАВАЙ адбылося пасяджэнне экспертна-кансультатыўнага савета пры Прэзідыуме Савета Рэспублікі

**Яго тэма — «Аб практыцы прымянення заканадаўства і рэалізацыі мерапрыемстваў у галіне меліярацыі зямель і іх эфектыўнага выкарыстання». Удзельнікамі пасяджэння сталі члены Савета Рэспублікі і дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, кіраўніцтва абласных і Любанскага раённага выканаўчых камітэтаў, абласных, раённага і сельскіх Саветаў дэпутатаў Любанскага раёна, рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, а таксама абласных меліярацыйных і лесагаспадарчых аб'яднанняў, землеўпарадкавальных аб'яднанняў, іншых арганізацый.**



Удзельнікі пасяджэння абмеркавалі меры, якія прымаюцца па выкананні даручэнняў кіраўніка дзяржавы па пытаннях меліярацыі зямель, ход рэалізацыі праграмных мерапрыемстваў у галіне меліярацыі зямель сельскагаспадарчага прызначэння. Асаблівую ўвагу засяродзілі на перспектывах уцягвання ў гаспадарчы абарот зямель сельскагаспадарчага прызначэння, занятых драўнінна-хмызняковай расліннасцю. Узнімаліся і пытанні прымянення заканадаўства, рэалізацыі мерапрыемстваў у галіне меліярацыі зямель і іх эфектыўнага выкарыстання.

Найперш удзельнікі пасяджэння экспертна-кансультатыўнага савета пры Прэзідыуме Савета Рэспублікі на чале з Наталляй Качанавай наведалі аб'ект «Рэканструкцыя меліярацыйнай сістэмы «Мар'інская» ў ААТ «БВА». Адказныя асобы далажылі аб стане меліярацыі ў Мінскай вобласці на канкрэтным аб'екце, агучылі задачы, пастаўленыя на бягучы год. Старшыня Савета Рэспублікі пацікавілася, ці выконваюцца даручэнні, пастаўленыя кіраўніком дзяржавы па пытанні меліярацыі. Яна звярнула ўвагу на тое, што правядзенне экспертна-кансультатыўнага савета дазволіць праверыць выкананне пастаўленых задач, выпрацаваць рашэнні, якія сёння неабходны для паляпшэння сітуацыі ў гэтай сферы. Удзельнікі пасяджэння азнаёміліся з тэхнікай, задзейнічанай падчас меліярацыі. Наталля Качанава пагутарыла з механізатарамі, якія на ёй працуюць.

### Новы імпульс далейшай рабоце

Звяртаючыся да ўдзельнікаў пасяджэння, Наталля Качанава нагадала, што экспертна-кансультатыўны савет пры Прэзідыуме Савета Рэспублікі быў створаны з мэтай разгляду найбольш актуальных пытанняў, якія датычацца сацыяльна-эканамічнага развіцця нашай краіны. Пачынаючы з 2020 года, праведзена шэсць пасяджэнняў савета. Кожнае з іх было прысвечана канкрэтнай тэме.

У лістападзе 2020 года на базе ААТ «Нафтан» і Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта ў Наваполацку абмяркоўваліся перспектывы развіцця інавацыйна-прамысловага Наваполацкага нафтахімічнага кластара. У чэрвені 2021 года прастан, тэндэнцыі і праблемы падрыхтоўкі навуковых кадраў для ўстаноў вышэйшай адукацыі гаварылі ў Гродне, на базе Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Пытанні ўдасканалення заканадаўства, будаўнічых норм і правіл на ўсіх стадыях інвестыцыйнага цыкла для стымулявання інвестыцый у праекты высокага тэхналагічнага ўкладу ўзнімаліся ў снежні 2021 года ў Пухавіцкім раёне, на базе ЗАТ «Беларуская нацыянальная біятэхналагічная карпарацыя».

Пасяджэнне экспертна-кансультатыўнага савета пры Прэзідыуме Савета Рэспублікі на тэму «Аб актуальных праблемах развіцця фармацэўтычнай галіны Рэспублікі Беларусь» адбылося ў кастрычніку 2022 года ў сталіцы, на базе Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Летась на пасяджэннях савета абмяркоўваліся ход выканання даручэнняў кіраўніка дзяржавы аб арганізацыі работы з адходамі (у Баранавічах) і перспектывы развіцця лёгкай прамысловасці ў Рэспубліцы Беларусь (у Віцебску). Па выніках усіх пасяджэнняў савета яго рэкамендацыі былі накіраваны адпаведным дзяржаўным органам і іншым арганізацыям.



«Разглядаліся тыя пытанні, якія сёння неабходна вырашаць у нашай краіне для таго, каб аб'яднаць усіх датычных да той ці іншай тэмы, разгледзець, што ёсць у нашай краіне па асобна ўзятай тэматыцы, — падсумавала работу папярэдніх пасяджэнняў савета Наталля Качанава. — Тады, калі мы сустракаемся і абмяркоўваем гэтыя пытанні, мы разумеем, што гэта пэўны новы імпульс далейшай рабоце, вызначаем кірункі: што ўжо зроблена, што яшчэ можна вырашыць, і нават у плане заканадаўства, якое рэгулюе пэўную галіну або той ці іншы від дзейнасці нашай краіны».

### «Перш за ўсё — эфектыўная работа прадпрыемстваў»

Гаворачы аб тэме бягучага пасяджэння экспертна-кансультатыўнага савета пры Прэзідыуме Савета Рэспублікі, Наталля Качанава нагадала аб даручэннях Прэзідэнта, дадзеных у 2022 годзе. «Аляксандр Рыгоравіч на нарадзе паставіў задачы — меліяраванне зямель, выкарыстанне зямельных рэсурсаў, навядзенне парадку на зямлі, — канкрэтызавала спікер. — Гэта тэма не новая. На працягу ўсёй гісторыі нашай суверэннай Беларусі Прэзідэнт робіць акцэнт на гэтым, бо зямля для нас — гэта галоўны рэсурс. Таму ў 2022 годзе, калі ён чарговы раз паставіў задачу, якая датычыцца меліярацыі ў нашай краіне, і вызначыў адказным тагачаснага віцэ-прэм'ера Леаніда Зайца, быў дакладна вызначаны пратакол даручэнняў, згодна з якім гэтыя работы павінны былі выконвацца.

У развіццё гэтай тэмы ўрад падрыхтаваў план, праграму, якая была зацверджана Леанідам Канстанцінавічам».

Нягледзячы на пераход апошняга на работу ў Савет Рэспублікі (Леанід Заяц узначальвае Пастаянную камісію па рэгіянальным развіцці і мясцовым самакіраванні), ён працягвае адказваць у краіне за меліярацыю, навядзенне парадку на зямлі. Задача — унікаць у гэтыя пытанні — пастаўлена ўсім членам Савета Рэспублікі. «Бо мы разумеем: перш за ўсё гэта эфектыўная работа прадпрыемстваў, якія займаюцца гэтымі пытаннямі, забеспячэнне тэхнікай, фінансаванне гэтых работ, укамплектаванасць кадрамі і, вядома, заканадаўчая, прававая база, якая дзейнічае ў нашай краіне, — патлумачыла Наталля Качанава. — Для нас гэтае пытанне важнае, як і для ўсіх».

### «З боку дзяржавы сёння прыняты ўсе меры»

Кажучы аб важнасці правядзення пасяджэнняў экспертна-кансультатыўнага савета, Наталля Качанава адзначыла, што такі фармат работы дазваляе ўбачыць, што зроблена ў той ці іншай галіне па выкананні даручэнняў Прэзідэнта, дае разуменне, як разглядаць тыя ці іншыя пытанні на экспертных саветах, якія функцыянуюць у Савеце Рэспублікі.

«Была пастаўлена задача — ураду сумесна з аблвыканкамамі забяспечыць у 2023—2025 гадах трохразовае павелічэнне ў адносінах да 2021 года аб'ёмаў рэканструкцый меліярацыйных сістэм і культур-тэхнічнай меліярацыі, — нагадала аб даручэнні кіраўніка дзяржавы Старшыня Савета Рэспублікі. — Атрымлівалася так, што па 81 тысячы гектараў трэба было штогод уводзіць у эксплуатацыю. Але па ўзгадненні з Прэзідэнтам, як мне дакладваюць, гэтыя лічбы былі павялічаны, і сёння штогод трэба ўводзіць у эксплуатацыю не менш за 110 тысяч гектараў для таго, каб выканаць даведзенае заданне. Безумоўна, для гэтага патрэбны арганізацыі, людзі, тэхніка, якая павінна быць спраўная, вырашыць пытанні рамонту тэхнікі. Мы ж не бясконца набываць не будзем, а сродкі, якія выдаткоўваюцца на набыццё, значныя».

Па словах спікера, на цяперашні час у краіне існуе 2 млн 810 тысяч гектараў меліяраваных зямель, што складае 37 % ад усёй плошчы сельскагаспадарчых угоддзяў. «У мэтах выканання даручэння неабходна ўвесці ў эксплуатацыю 412 тысяч гектараў меліяраваных зямель, — падкрэсліла Наталля Качанава. — Фактычна за тры гады было ўведзена ў эксплуатацыю 195 тысяч гектараў зямель, а за два гады, 2024 і 2025, трэба ўвесці 277 тысяч гектараў. Заданне вельмі напружанае. Таму работы, вядома, чакаюцца сур'ёзныя».

Старшыня Савета Рэспублікі канстатавала, што ў краіне функцыянуе 132 меліярацыйныя арганізацыі. Па яе словах, для гэтых арганізацый выдзелены сродкі. Для правядзення работ у 2024 годзе прадугледжана 528 мільёнаў рублёў. «З боку дзяржавы сёння прыняты ўсе меры для таго, каб пастаўленыя задачы былі выкананы», — падкрэсліла спікер.

Наталля Качанава дадала, што павінен быць жорсткі кантроль за станам асушаных земляў — там, дзе правялі меліярацыю. «Мы павінны кожны метр сваёй зямлі шанаваць, — арыентавала спікер. — Гэта праца, гэта грошы. Мы выдзяляем грошы з бюджэту, а маглі б іх накіраваць на іншыя мэты. Таму самы жорсткі кантроль і адказнасць!»

### «Трэба жыць па-гаспадарску»

Нагадала спікер і аб даручэнні кіраўніка дзяржавы, якое датычыцца нарыхтоўкі траў у поймах. Як высветлілася, не ўсімі яно выконваецца. «Мы не павінны так адносіцца да сваёй зямлі, да даручэнняў Прэзідэнта, бо яны дакладна і правільна выверany, — звярнула ўвагу Наталля Качанава. — Калі так сказаў Прэзідэнт — трэба рабіць, бо гэта дасць свой вынік».

Асаблівую ўвагу Старшыня Савета Рэспублікі засяродзіла на пытанні ўкамплектаванасці галіны спецыялістамі. «Кадры — гэта асноватворнае ў гэтай рабоце», — пакрэсліла спікер. Акрамя таго, па яе меркаванні, у галіне меліярацыі важна ўдзяляць увагу дысцыпліне і парадку.

Намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Уладзімір Гракун расказаў аб практыцы прымянення заканадаўства і рэалізацыі мерапрыемстваў у галіне меліярацыі зямель і іх эфектыўнага выкарыстання. Падчас дакладаў іншых службовых асоб прагучалі пытанні перспектыў уцягвання ў гаспадарчы абарот зямель сельскагаспадарчага прызначэння, занятых драўнінна-хмызняковай расліннасцю, недахопаў у меліярацыйным комплексе і шляхоў павышэння яго эфектыўнасці. Асаблівая ўвага — рэалізацыі праграмных мерапрыемстваў у галіне меліярацыі зямель сельскагаспадарчага прызначэння ў 2023 годзе і на перыяд да 2030 года, а таксама мерам, якія прымаюцца па выкананні даручэнняў кіраўніка дзяржавы па пытаннях меліярацыі.

«Трэба жыць па-гаспадарску, — рэзюмуючы, падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі. — Так, як кожны ў сябе ў доме робіць. Трэба так і ў краіне. Яна ў нас адна. Іншай не будзе. І мы павінны зрабіць усё для таго, каб дзесьці асушыць, а дзесьці і паліваць».

Па словах Наталлі Качанавай, на савеце былі агучаны тыя пытанні, якія неабходна вырашаць па выкананні задач і даручэнняў, пастаўленых кіраўніком краіны па ўцягненні ў абарот зямель сельгаспрызначэння, што дагэтуль былі непрыдатныя, а пасля правядзення меліярацыйных работ выкарыстоўваюцца. «Акцэнт — на эфектыўнасці вырашэння тых задач, якія перад намі стаяць, — арыентавала яна. — Трэба рабіць так, каб гэта сапраўды давала свой вынік. Тыя задачы, якія пастаўлены, вядома, павінны быць выкананы. Для гэтага ўсё ёсць. Сродкі ёсць, арганізацыі ёсць, вертыкаль выбудавана. Таму трэба сёння ўсім закасаць рукавы, як кажа Прэзідэнт нашай краіны, і адказна працаваць кожнаму на сваім месцы».

Старшыня Савета Рэспублікі пажадала поспехаў у выкананні пастаўленых задач і даручэнняў. Завяршылася мерапрыемства ўскладаннем кветак да мемарыяльнага комплексу «Савецкім актывістам, воінам, партызанам і падпольшчыкам».

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА.**

*Любанскі раён.*

# «КАЛІ ГАВОРКА ІДЗЕ ПРА БУДУЧЫНЮ КРАІНЫ,

## Педагог — ключавая фігура

***— Андрэй Іванавіч, які са складнікаў якасці адукацыі вы лічыце найважнейшым?***

— Падрыхтоўка будучага настаўніка. Сёлета ў нас у гэтым плане прадбачацца сур'ёзныя змены — павялічваем набор на педагагічныя спецыяльнасці практычна на тысячу будучых нашых абітурыентаў і плануем набраць каля шасці тысяч першакурснікаў, якія, спадзяюся, у недалёкай будучыні прыйдуць у школы і стануць настаўнікамі: пачатковых класаў, прадметнікамі, педагогамі сацыяльнымі і педагогамі-псіхолагамі, гэта значыць тымі людзьмі, каму мы зможам даверыць нашых дзяцей. Каб так і было, мы правялі дастаткова сур'ёзную работу па карэкціроўцы і ўдасканаленні адукацыйных праграм. Ужо з першага верасня 2023/2024 навучальнага года нашы будучыя настаўнікі пачалі вучыцца па новым адукацыйным стандарце, па новых праграмах.

***— Што ў іх прынцыпова новага?***

— Першае і самае важнае тое, што для ўсіх студэнтаў — будучых педагогаў практыкаарыентаванасць і праходжанне адпаведных практык пачынаецца ўжо з першага курса. Гэта дазваляе ім на старце навучання адчуць, што такое прафесія педагога. Другое — абсалютна кожны будучы настаўнік сёння мае ў вучэбнай праграме блок па інклюзіўнай адукацыі, незалежна ад таго, рыхтуем мы дэфектолага, выкладчыка фізікі або інфарматыкі. Блок інклюзіўнай адукацыі ўжо ўключаны ў праграму і з'яўляецца абавязковым дзяржаўным кампанентам.

***— Сёння гэта важна?***

— Колькасць асаблівых дзяцей, якія маюць патрэбу ў спецыяльных метадах навучання ў нас, на жаль, расце. Сёння такіх дзяцей да 7 працэнтаў ад усіх навучэнцаў. У кожнай школе. І складанасці ў працэсе іх навучання павялічваюцца. Мы ўсведамляем, з якімі цяжкасцямі сустрэнуцца ў школе педагогі. Новая ж праграма дазваляе нам з упэўненасцю глядзець у будучыню і ведаць, што праз чатыры гады кожны выпушчаны з універсітэта настаўнік будзе валодаць як інклюзіўнай культурай, так і методыкамі работы з асаблівымі дзецьмі. Прычым на высокім прафесійным узроўні.

## Быць настаўнікам — гэта талент

***— Прафесія педагога не займае першыя радкі ў рэйтынгу папулярнасці сярод абітурыентаў...***

— Стараемся прыцягнуць у гэтую прафесію моладзь.

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***



Фота БелТА.

Прычым моладзь таленавітую. З гэтай мэтай працягваем траекторыю прытоку адораных дзяцей у настаўніцкую прафесію. Сёлета, напрыклад, выпускнікі Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка, якія атрымалі адпаведную рэкамендацыю наглядальнага савета, без іспытаў змогуць паступіць на педагагічныя спецыяльнасці. Гэта сапраўды таленавітыя юнакі і дзяўчаты, якія паспяхова прайшлі не адну адукацыйную змену. Мы чакаем іх і бачым не толькі высокакваліфікаванымі кадрамі для рэальнага сектара эканомікі, але і для сістэмы адукацыі.

Працягваем таксама набор медалістаў на педагагічныя спецыяльнасці, без іспытаў. Пашыраем сетку педагагічных класаў. Сёлета ў такіх класах вучыліся восем з паловай тысячы школьнікаў, прычым кожны трэці з іх сваёй будучай прафесіяй выбірае прафесію педагога. Мы чакаем, што менавіта гэтыя дзеці — медалісты, выпускнікі педагагічных класаў, нацыянальнага тэхнапарка — і складуць касцяк тых, хто справай свайго жыцця вызначыць настаўніцкую працу.

Акрамя таго, вядзецца вялікая выхаваўчая работа. Яна накіравана на тое, каб сённяшні школьнік убіраў і павагу да сваіх педагогаў, і любоў да гэтай прафесіі настолькі, каб свядома выбраць яе. Тут, вядома, вялікую ролю іграе і асабісты прыклад педагога. Вынікі такога камбінаванага падыходу ўжо ўражваюць: літаральна два гады таму колькасць дзяцей, якія паступілі на дзённую бюджэтную форму адукацыі ў БДПУ імя М. Танка з ліку медалістаў, выпускнікоў педагагічных класаў, была прыкладна 30—35 працэнтаў, а ў мінулым годзе іх ужо палова: кожны другі студэнт першага курса педагагічнага ўніверсітэта альбо медаліст, альбо выпускнік педкласа. У гэтым годзе з улікам павялічаных лічбаў набору мы павысілі планку да 60 працэнтаў.

## Галоўны памочнік

***— Кнігі і падручнікі па-ранейшаму застаюцца галоўнымі памочнікамі навучэнцаў, студэнтаў, педагогаў. Якая сітуацыя з навучальнай літаратурай? З якой перыядычнасцю выдаюць ці перавыдаюць падручнікі?***

— Навучальныя праграмы і дапаможнікі якраз і з'яўляюцца другім важным кірункам забеспячэння якасці адукацыйнага працэсу. У 2021 годзе мы ўпершыню завяршылі выданне нацыянальнай лінейкі навучальных дапаможнікаў для ўсяго курса агульнаадукацыйнай школы. І з таго ж года распачалі працэс іх перавыдання. Ніякіх глабальных змен не было — апрацоўвалі, дашліфоўвалі тыя падручнікі, што ўжо былі, а гэта больш за 220 навучальных дапаможнікаў.

Паўтара года таму мы правялі глыбокі аналіз існуючай вучэбнай літаратуры. І ён паказаў, што сур'ёзнай перапрацоўкі патрабуюць толькі пяць навучальных дапаможнікаў. У гэтым годзе мы заканчваем іх перавыданне. Яшчэ 60 дапаможнікаў плануем перавыдаць у найбліжэйшыя два гады.

***— Якім у ідэале павінен быць школьны падручнік — для вучняў, іх настаўнікаў і бацькоў?***

— Даступныя тэксты і добры метадычны апарат — каб матэрыял добра засвойваўся і быў цікавы дзецям. З іншага боку, мы істотна пашыраем і ўзмацняем выхаваўчы патэнцыял падручніка. Як гэта робім? Возьмем самае простае — чытанку. Дзіця вучыць літары і бачыць, што літара «Б» — гэта Беларусь, літара «Р» — Радзіма, літара «М» — маці. Ужо няма банана, маліны ці рака. Мы фактычна вяртаемся да тых вытокаў, якія былі ў савецкі час. Пагадзіцеся, лепшых за тагачасныя падручнікі ў выхаваўчым плане не было.

Не толькі ў чытанкі, але і ў навучальныя дапаможнікі па прыродазнаўчанавуковых дысцыплінах мы таксама ўносім сур'ёзны выхаваўчы патэнцыял, які фарміруе гонар за нашу краіну, нашу эканоміку, прамысловасць, сельскую гаспадарку, сацыяльную сферу. Усё гэта ідзе як праз адпаведныя заданні, так і праз тэксты заданняў.

***— Гучаць думкі, ад бацькоў у першую чаргу, што цяперашнія праграмы для школьнікаў даволі складаныя...***

— На сёння адукацыйная праграма абсалютна адпавядае сучаснасці і спрашчаць яе не трэба. А вось яе форму і даступнасць, згодны, неабходна паляпшаць. І мы гэта робім. Важнай падзеяй стане выхад у жніўні ў свет навучальнага дапаможніка па гісторыі Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі для 10 класаў. Гэтая вялікая навацыя закране ўсе школы нашай краіны: з 1 верасня дзесяцікласнікі будуць вывучаць не два вучэбныя прадметы — гісторыю Беларусі і сусветную гісторыю, а адзін курс — гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі. Гэта навучальны дапаможнік новага пакалення, той падручнік, які хочацца чытаць кожны дзень, не адрываючыся, з вялікай цікавасцю. Там расстаўлены акцэнты на тых гістарычных момантах, якія па-сапраўднаму павінен ведаць кожны грамадзянін, кожны патрыёт сваёй краіны, ведаць і ганарыцца імі.

## Справядліва і празрыста

***— Ідзе самая напружаная для школьнікаў і абітурыентаў пара. Ужо прайшлі цэнтралізаваныя іспыты, наперадзе — уступная кампанія. Як усё праходзіць сёлета?***

— Школьнікі другі год здаюць цэнтралізаваны экзамен. З першага разу, першага года, магчыма, атрымалася не ўсё так гладка, як задумвалася. Але гэта нармальны працэс, бо пераход на прынцыпова новую форму выніковай атэстацыі за курс агульнаадукацыйнай школы — сур'ёзная сістэмная работа, якая і была праведзена. І яе вынікі заслухоўваліся на нарадзе ў кіраўніка дзяржавы.

Што мы маем сёння? Упэўненасць у правільным выбары. Мы прыбралі пытанні, якія былі прыдуманы, што называецца, наўздагад, і цалкам прывялі тэставыя заданні ў адпаведнасць са школьнай праграмай. Такім чынам, выпускнікоў не чакалі сюрпрызы ў выглядзе ўскладненых задач, якія не ўваходзяць у школьную праграму, і гэтак далей. Гэта адзначаюць і самі выпускнікі — сёлета і на рэпетыцыйным экзамене, і на цэнтралізаваным тэсціраванні пытанні адпавядаюць таму, што яны вывучалі ў школе. Гэта было прынцыповае патрабаванне Прэзідэнта, і мы яго выканалі.

Яшчэ адзін важны аспект — справядлівасць. Усе выпускнікі 11 класаў знаходзяцца ў аднолькавых, з пункту гледжання аб'ектыўнасці ацэнкі іх ведаў, умовах. Для нас гэта прынцыповы момант, і менавіта таму мы вядзём сур'ёзную, нават жорсткую работу, каб не было ні аднаго парушэння з боку тых, хто экзаменуецца: наяўнасць пры сабе мабільнага тэлефона, выкарыстанне шпаргалак або іншай дапамогі збоку. Важна, каб не толькі кожны выпускнік, але і яго бацькі былі ўпэўнены ў тым, што ўсе дзеці, а не толькі яго дзіця, знаходзяцца ў аднолькавых умовах. Важна яшчэ гэта і таму, што вынік цэнтралізаванага экзамену можа быць скарыстаны і пры паступленні ва ўніверсітэт.

## Умець прымяніць

***— Вядома, што ў 2023 годзе было праведзена нацыянальнае даследаванне якасці адукацыі. Калі можна, крыху падрабязнасцяў: яго мэты, задачы, вынікі.***

— Асноўнай мэтай была ацэнка функцыянальнай адукаванасці навучэнцаў. У ходзе даследавання вызначалася, наколькі сённяшнія юнакі і дзяўчаты гатовы да дарослага жыцця, вырашэння рэальных жыццёвых праблем з выкарыстаннем тых ведаў і ўменняў, якія яны атрымалі ва ўстановах адукацыі. Адзначу, што даследаванне не замяняе якасную сістэматычную ацэнку адукацыйных дасягненняў, а праводзіцца нараўне з ёю.

Функцыянальнай адукаванасці мы ўдзяляем вялікую ўвагу і разглядаем яе больш як элемент павышэння ўзроўню якасці адукацыі, чым як асобны элемент навучання. Яна будзе праходзіць чырвонай ніткай праз увесь агульнаадукацыйны працэс у школах — кожны навучэнец павінен вывучыць і ведаць пэўныя законы фізікі, хіміі, матэматыкі і ўмець прымяняць іх для вырашэння тых ці іншых практычных задач, з якімі ён абавязкова ў жыцці сутыкнецца. Няхай гэта будзе ў каледжы, універсітэце ці на першым працоўным месцы.

Яшчэ адна траекторыя, якая не замяняе адукацыйны працэс, але надае яму асаблівы імпульс і спрыяе павышэнню ўзроўню адукацыі, — алімпіядны рух. Мы плануем развіваць яго і надалей. Нашы школьнікі і сёння паказваюць высокія вынікі на міжнародных спаборніцтвах: восем з дзесяці вяртаюцца адтуль з медалямі. Але ёсць яшчэ вялікі патэнцыял, які можна і трэба раскрыць. Для гэтага з 1 верасня 2024 года мы запусцім элементы круглагадовай завочнай алімпіяды, каб свае сілы і здольнасці магло праверыць абсалютна любое дзіця з любога кутка Беларусі. Паралельна прыцягнем найлепшых педагогаў, якія будуць праводзіць навучанне як настаўнікаў, якія займаюцца падрыхтоўкай хлопчыкаў і дзяўчынак да алімпіяднага руху, так і саміх дзяцей. Думаю, аб'яднанне такой дыстанцыйнай алімпіяды з вочнымі зборамі хлопчыкаў і дзяўчынак і інтэнсівамі па іх рабоце перад выездам на заключны этап рэспубліканскіх спаборніцтваў або на міжнародныя этапы дасць яшчэ больш высокі паказчык.

Уласна, нічога новага мы не вынайшлі — такія формы выкарыстоўваліся ў савецкі час, яны захаваліся па цяперашні час у Расіі і Кітаі. Некаторыя элементы праводзіліся і ў нас. Сёння мы проста выводзім гэтую дзейнасць на прынцыпова новы, сістэмны ўзровень.

## Працоўны клас — гэта гучыць ганарова

***— Сёння кіраўнік дзяржавы арыентуе на вырашэнне кадравых праблем у прамысловасці. Адно з яго патрабаванняў — падняць прэстыж працоўных прафесій.***

— У гэтым кірунку мы працуем вельмі актыўна. З кожным годам павялічваем колькасць дзяцей, якія паступаюць у каледжы на бюджэтную форму атрымання адукацыі пасля 9 класаў. Ці ёсць зрухі? Ёсць. Сёння мы практычна выйшлі на лічбу, калі кожны другі выпускнік дзявятага класа выбірае шлях у каледж. Літаральна 2-3 гады таму такі выбар рабіў толькі кожны трэці выпускнік базавай школы.

Ёсць некалькі прычын развіцця менавіта ў гэты бок. Па-першае, маладыя людзі сталі больш свядома рабіць свой выбар. Па-другое, іх прыцягваюць умовы, якія створаны сёння ў каледжах. Нам удалося стварыць 52 цэнтры кампетэнцый, больш за тое, там пастаянна абнаўляецца матэрыяльна-тэхнічная база. Дзеці праходзяць падрыхтоўку на сучасным абсталяванні, якое сёння ёсць нават не на кожнай вытворчасці. Па сутнасці, там рыхтуюць кадры заўтрашняга дня. Ці трэба казаць аб тым, наколькі будзе запатрабаваны такі спецыяліст на вытворчасці?..

І потым, цяперашні абітурыент вельмі прагматычны. Ён глядзіць не толькі на тое, куды хоча паступаць і якую спецыяльнасць атрымаць, — ён хоча зразумець, дзе ён будзе працаваць. У гэтым плане моладзь, якая паступае ў каледж і атрымлівае рабочую прафесію, чакаюць вялікія перспектывы. Калі спецыяліст запатрабаваны, для яго і прывабныя ўмовы працы ствараюць, і заробак годны прапаноўваюць. Шмат плюсоў, таму траекторыю паступлення ў каледжы пасля дзявятага класа мы, вядома, будзем развіваць.

Для тых, хто ўсё ж вырашае застацца ў школе, прапаноўваецца некалькі вектараў: навучанне ў профільным або базавым класе. Калі казаць аб апошнім, то навучэнцы такіх класаў разам з атэстатам атрымліваюць і працоўную прафесію, якой яны вучацца на базе каледжаў, а па заканчэнні здаюць кваліфікацыйны экзамен. Перад такім выпускніком адкрываюцца адразу тры шляхі: ён можа прадоўжыць адукацыю ў ВНУ, каледжы або адразу працаўладкавацца.

Скажу больш: магчымасць атрымаць працоўную прафесію сёння маюць і студэнты ВНУ ў рамках студатрадаўскага руху, якія навучаюцца на інжынерных спецыяльнасцях. Пагадзіцеся, калі архітэктар разумее працу прараба, калі ведае, як працуе плітачнік і гэтак далей, — усё гэта толькі ў плюс і яму, і агульнай справе.

Яшчэ адзін важны аспект павышэння прэстыжу рабочай прафесіі — конкурсы

# ДРОБЯЗЯЎ БЫЦЬ НЕ МОЖА»

прафесійнага майстэрства. У 2024 годзе мы правялі V юбілейны Рэспубліканскі конкурс ProfSkills, пераможцы якога прымуць удзел у міжнародных стартах.

## Дзе нарадзіўся, там і згадзіўся

***— Кваліфікаваныя кадры запатрабаваны не толькі на прамысловых прадпрыемствах, але і ў рэгіёнах у цэлым. Між тым у кожным абласным цэнтры ёсць свае, і вельмі моцныя, ВНУ. Аднак моладзь з правінцыі, як і дзесяцігоддзі таму, адпраўляецца па веды і дыплом у сталічныя ўніверсітэты. Чаму так?***

— Пытанне сапраўды ёсць. Але мы яго вырашаем. З мінулага года, дзякуючы падтрымцы кіраўніка дзяржавы, пачалі праводзіць універсітэцкія алімпіяды, прычым толькі ў рэгіянальных універсітэтах. Па выніках такіх алімпіяд школьнікі фактычна ўжо ў сакавіку становяцца студэнтамі гэтых ВНУ. У 2024 годзе больш за 1000 навучэнцаў з рэгіёнаў сталі пераможцамі ўніверсітэцкіх алімпіяд. Чакаем, што роўна на столькі там павялічыцца і колькасць студэнтаў.

Мы зрабілі магчымым сярэбраным і залатым медалістам, а іх па прагнозах ва ўсіх абласцях набярэцца каля 4,5 тысячы, таксама без экзаменаў паступаць у любую рэгіянальную ВНУ. Гэтую навацыю выкарыстоўваем упершыню ў сёлетнюю ўступную кампанію і спадзяёмся, што абітурыенты застануцца ва ўніверсітэтах на сваёй малой радзіме, а затым там жа пачнуць працоўную дзейнасць.

Цалкам справядлівая заўвага, што абласныя ўніверсітэты — гэта ўстановы адукацыі з традыцыямі, імем і аўтарытэтам. Скажу больш: і забяспечанасць кадрамі, і матэрыяльна-тэхнічная база там не адрозніваюцца ад сталічных універсітэтаў. Паказальны факт: замежныя студэнты выбіраюць не толькі мінскія ВНУ, але і рэгіянальныя.

Нямногія ведаюць, што некаторыя рэгіянальныя ўніверсітэты маюць унікальную спецыялізацыю, якой няма больш ні ў адной ВНУ краіны. Напрыклад, Магілёўскі ўніверсітэт хімічных тэхналогій — адзіны ў Беларусі, які рыхтуе спецыялістаў для харчовай прамысловасці. Віцебскі тэхналагічны ўніверсітэт спецыялізуецца на падрыхтоўцы кадраў для лёгкай прамысловасці, такіх у краіне таксама больш няма. Віцебская ветэрынарная акадэмія, Полацкі ўніверсітэт, Горацкая сельскагаспадарчая акадэмія, Купалаўскі ўніверсітэт і іншыя — гэта ж сапраўдныя брэнды, са сваёй асобай, сваім гучным імем і найвышэйшым узроўнем выкладання.

## З малых пазногцяў

***— Вырашэнне якіх задач па павышэнні якасці работы дашкольных устаноў адукацыі вы лічыце першачарговымі?***

— Найбольш адчувальным аспектам для бацькоў сёння з'яўляецца даступнасць дашкольнай установы. Мы працуем у гэтым кірунку. Так, зроблены інтэрактыўныя карты ўстаноў дашкольнай адукацыі па кожным раёне, якія штомесяц абнаўляюцца. На іх у рэжыме рэальнага часу можна бачыць колькасць месцаў у дзіцячых садках. Можна выбраць установу дашкольнай адукацыі паблізу з домам або работай, недалёка ад месца, дзе пражываюць бабулі-дзядулі, і гэтак далей. Сёлета плануем скончыць пераход у электронную форму дзвюх адміністрацыйных працэдур — пастаноўкі на ўлік ва ўстанову дашкольнай адукацыі і выдачы накіравання. І ў тым, і ў іншым выпадку не трэба будзе ісці ні ў раённы аддзел адукацыі, ні ў райвыканкам, для таго каб стаць у чаргу ці атрымаць накіраванні. Гэта можна будзе зрабіць нават з мабільнага тэлефона ў любы зручны для аднаго з бацькоў час.

Што датычыцца самога адукацыйнага працэсу, то Праграма развіцця ўстаноў дашкольнай адукацыі, прынятая на 2024—2025 гады, прадугледжвае павышэнне кваліфікацыі выхавацеляў і прыняцце новых адукацыйных праграм па рэалізацыі больш сур'ёзных выхаваўчых, патрыятычных, грамадзянскіх функцый. Ужо нікога не здзівіш тым, што сёння ва ўстановах дашкольнай адукацыі вывучаюць дзяржаўныя сімвалы, іх значэнне, а дзеткі спяваюць гімн. І гэта правільна: грамадзяне Беларусі з самага малога ўзросту павінны ганарыцца краінай, дзе нарадзіліся, дзе жывуць.

## Здаровыя дзеці — здаровая нацыя

***— Эксперымент па навацыі ў арганізацыі школьнага харчавання абмяркоўваўся ледзь не больш за іншыя. Але затое сёння з поўнай упэўненасцю можна сказаць: настаўнікі, бацькі і, самае галоўнае, дзеці прынялі навацыі «на ўра».***

— Быць можа, гэтая тэма нават набіла камусьці аскоміну, але, як кажуць у народзе, аўчынка аказалася вартай вычынкі. У пілотным праекце бралі ўдзел усяго 23 школы з розных рэгіёнаў Беларусі. Да канца 2024 навучальнага года ўжо больш за 70 працэнтаў школ краіны перайшлі на новы прынцып арганізацыі школьнага харчавання. З 1 верасня ахоп будзе стапрацэнтны.

Вынік сапраўды добры. Дзеці сталі лепш есці. У нас больш за 65 працэнтаў школьнікаў харчуюцца за кошт сродкаў бюджэту. Гэта вялізныя грошы. Але і такі ж вялізны клопат аб маладым пакаленні. Цяпер мы дасягнулі таго балансу, калі дзеці сыты і задаволены, а ўкладзеныя ў іх харчаванне бюджэтныя рублі выкарыстоўваюцца эфектыўна.

Паспяховая рэалізацыя эксперымента фарміравалася з трох складнікаў. Першае — гэта тое, што гатуем. Тэхналагічныя карты кардынальна змяніліся, быў распрацаваны прынцыпова новы іх зборнік. Пры правядзенні апрабацыі страў наладзілі зваротную сувязь з вучнямі і іх бацькамі. Нешта спадабалася, нешта — не. У выніку ў школьнае меню ўвайшлі менавіта тыя стравы, якія атрымалі станоўчую ацэнку.

Другі складнік — аснашчанасць харчаблокаў. Мы цудоўна разумеем: каб прыгатаваць і накарміць 1,5—2 тысячы школьнікаў штодзень, — а ў цэлым у Беларусі штодзень харчуецца 1 мільён дзяцей, — патрэбныя адпаведныя магутнасці і сучаснае тэхналагічнае абсталяванне. Параканвектаматы, міксеры, фростары, дэфростары — усё гэта сёння ёсць у школьных харчаблоках. А цяпер мы фактычна заканчваем аснашчэнне іх пасудамыечнымі машынамі.

Наступны складнік — кваліфікацыя кухараў. Усе яны ў свой час прайшлі кваліфікацыю і сёння маюць неабходны чацвёрты разрад.

## Міжнароднае супрацоўніцтва

***— Раскажыце аб міжнародных кантактах міністэрства. Як яны змяніліся ва ўмовах санкцый? Скарацілася супрацоўніцтва ці, наадварот, павялічылася, але ўжо па іншых напрамках і што гэта дае айчыннай сферы адукацыі?***

— Працягваем сур'ёзнае супрацоўніцтва з краінамі Садружнасці. Нядаўна адбылося пасяджэнне сумеснай калегіі профільных міністэрстваў Расійскай Федэрацыі і Беларусі. Спектр пытанняў, якія былі там разгледжаны, выйшаў за рамкі парадку дня. У нас шмат агульных тэм, а ўзровень узаемадзеяння з расійскімі калегамі дасягнуў той фазы, калі мы не проста размаўляем на адной мове, глядзім у адным напрамку. Мы чытаем адно аднаго без слоў. Што датычыцца важных дамоўленасцяў, то цяпер адпрацоўваем механізм перадачы нашых навучальных дапаможнікаў па прыродазнаўча-навуковым блоку, школьных падручнікаў і падручнікаў з каледжаў — Расіі для таго, каб на іх аснове там зрабілі сваю лінейку нацыянальных навучальных дапаможнікаў. Для нас гэта высокая ступень даверу: расійскія калегі будуць браць нашы дапаможнікі ў якасці прыкладу або асновы для складання сваіх. Мы дасягнулі таксама сур'ёзных дамоўленасцяў у развіцці інклюзіўнай адукацыі. Тут наадварот — у нас ёсць сур'ёзная цікавасць да тых напрацовак, якія маюцца ў расійскіх калег: гэта і сур'ёзная навуковая школа, і добрае метадычнае забеспячэнне, а галоўнае — расіяне гатовы не проста цалкам аддаваць свае распрацоўкі, але суправаджаць іх укараненне. Для нас гэта мае значэнне — суправаджэнне спецыялістаў значна паскорыць час не толькі асэнсавання гэтых распрацовак, але і выкарыстання іх у рэальным жыцці.

Асацыяцыя школ Беларусі і Расіі — яшчэ адзін важны інструмент супрацоўніцтва. Педагогі брацкіх краін на пастаяннай аснове абменьваюцца вопытам, настаўнікі праводзяць тэлемасты, ідзе абмен дэлегацыямі, прычым не толькі ў галіне адукацыйнай, але і выхаваўчай. У асацыяцыю ўжо ўваходзіць больш за 500 школ, але тэмп росту такі, што, я думаю, у далейшым колькасць устаноў адукацыі гэтай арганізацыі павялічыцца кратна.

Увесну адбыўся вялікі візіт дэлегацыі Міністэрства адукацыі ва Узбекістан. Там таксама дасягнута шмат дамоўленасцяў. Напрыклад, выйшлі на цікавы праект — падрыхтоўку кадраў для ўстаноў дашкольнай адукацыі Узбекістана — і рыхтуемся адкрыць там сумесны факультэт, дзе беларускія выкладчыкі будуць рыхтаваць узбекскіх выхавацеляў. Другі сур'ёзны напрамак — гэта падрыхтоўка кадраў рабочых спецыяльнасцяў. Мы фактычна пад ключ плануем стварыць ва Узбекістане цэнтр апераджальнай падрыхтоўкі, цэнтры кампетэнцыі, якія будуць рыхтаваць высакакласных спецыялістаў для прамысловасці краіны.

Мы плануем таксама ўдзел у форуме міністраў адукацыі краін БРІКС. І ўжо сёння ў якасці запрошаных членаў прымаем удзел у рабоце міністраў адукацыі краін ШАС. Спадзяёмся пры падтрымцы Расійскай Федэрацыі і Кітайскай Народнай Рэспублікі стаць не проста актыўнымі ўдзельнікамі адукацыйнага працэсу краін Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва, але і прыняць у сябе чарговае пасяджэнне кіраўнікоў адукацыйных ведамстваў.

Дынамічна развіваецца і афрыканскі вектар. Сёння ўжо відавочна, як расце колькасць студэнтаў з гэтага кантынента, якія вучацца ў нас у краіне. Зімбабвэ, Экватарыяльная Гвінея і іншыя... Калі казаць аб геаграфіі супрацоўніцтва, то яна пастаянна пашыраецца, і сёння гэта ўжо больш за 100 краін свету. У нас навучаецца больш чым 30 тысяч замежных студэнтаў. І ёсць куды расці. Але гэта не самамэта. У аснову мы ўсё ж павінны ставіць якасць падрыхтоўкі нашых студэнтаў для эканомікі Беларусі.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**

# ПОГЛЯД У ЗАЎТРА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



— Рашэнні, што дэманструюцца на форуме «ТІБА», ствараюць імідж Беларусі як ІТ-краіны, — падкрэсліў на ўрачыстай цырымоніі адкрыцця міжнароднага форуму па інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогіях «ТІБА-2024» **прэм'ер-міністр Раман ГАЛОЎЧАНКА.**

«ТІБА» — найбольш значная падзея ў сферы ІКТ Беларусі, магчымасць аналізу міжнароднага вопыту, стану і перспектыў лічбавага развіцця, абмеркавання сучасных тэндэнцый развіцця ІТ-сферы. Сярод яго ўдзельнікаў — органы дзяржаўнага кіравання, міжнародныя арганізацыі і дыпламатычныя місіі, замежныя афіцыйныя дэлегацыі, прафесійныя і бізнес-асацыяцыі, навукова-даследчыя і адукацыйныя ўстановы, дзяржаўныя і прыватныя кампаніі. У гэтым годзе, як і ў папярэднія, у «ТІБА» прымаюць удзел буйныя вытворцы тэлекамунікацыйнага абсталявання, апаратных сродкаў і праграмнага забеспячэння, кампаніі-аператары мабільнай і фіксаванай сувязі, распрацоўшчыкі і пастаўшчыкі высокатэхналагічных прадуктаў, сістэм бяспекі, інтэлектуальных рашэнняў і сэрвісаў. Менавіта ім трэба вырашаць надзённыя задачы ў сферы «высокіх тэхналогій».

Сярод такіх задач Раман Галоўчанка назваў неабходнасць па максімуме перавесці ўзаемадзеянне дзяржавы, грамадзян і бізнесу ў лічбавы фармат.

Многае ў гэтым кірунку ўжо зроблена.

— Мы алічбавалі разлік падаткаў грамадзян, мытныя і падатковыя дэкларацыі, цалкам перавялі ў электронны від збор статыстычнай інфармацыі, у тым ліку ў працоўнай сферы — улік даходаў, працоўнага стажу, пенсій, — падкрэсліў Раман Галоўчанка. — Беларусь першай сярод краін СНД правяла перапіс насельніцтва ў электронным фармаце. У «лічбе» кантралююцца кошты ў будаўніцтве, цэны імпартных тавараў. Створаныя сістэмы дазваляюць ацэньваць усе стадыі росту цаны на тавар, прадказваць сезонныя ваганні, узнікненне лішку або недахопу пэўных тавараў і з'яўляюцца незаменным інструментам у працэсе рэгулявання надзённых пытанняў цэнаўтварэння.

У рамках дзяржпраграмы «Лічбавае развіццё Беларусі» ўкаранёна адзіная сістэма ўліку і апрацоўкі зваротаў грамадзян і юрыдычных асоб, адзіны рэестр ліцэнзій, інфармацыйная сістэма «Вітрына лічбавых праектаў» і іншыя рашэнні. Для зручнасці прадстаўлення насельніцтву дзяржаўных паслуг распрацаваны мабільны дадатак, які дае магчымасць выкарыстоўваць ідэнтыфікацыю карыстальніка з дапамогай ID-карты, сказаў Раман Галоўчанка.

Адзін з самых «прасунутых» у сферы ІТ — фінансава-крэдытны сектар нашай краіны, звярнуў увагу прэм'ер-міністр:

— Развіваюцца бескантактныя тэхналогіі і плацежныя сэрвісы. Кожны банк аказвае паслугі мабільнага і інтэрнэт-банкінгу. Створана сістэма аплаты праезду па QR-кодзе. Больш за 85 % юрыдычных і каля 70 % фізічных асоб узаемадзейнічаюць з банкаўскімі ўстановамі ў рэжыме анлайн. У рамках замяшчэння замежных сэрвісаў працягваецца развіццё айчынных рашэнняў бескантактнай аплаты (гэта «Белкарт Pay» і «Оплати»). Істотна вырасла і доля безнаяўных разлікаў у рознічным тавараабароце. Калі ў 2019 годзе яна складала крыху менш за 45 %, то па выніках першага квартала бягучага года ўжо амаль 60 %. Перспектыўным напрамкам развіцця электронных форм безнаяўных разлікаў з'яўляецца лічбавы рубель. Нацыянальным банкам распрацавана і зацверджана канцэпцыя беларускага лічбавага рубля, вядзецца распрацоўка платформы на адкрытым блокчэйне. Гэта робіцца ўжо сёння. Мы бачым вялікую цікавасць да розных лічбавых сэрвісаў, паколькі зручна ўзаемадзейнічаць з дзяржавай не выходзячы з дому і атрымліваючы імгненны вынік.

У ліку найбольш прыярытэтных задач Раман Галоўчанка назваў будаўніцтва сеткі 5G з прынцыпова новай архітэктурай бесправаднога шырокапалоснага доступу, што дасць магчымасць укараніць найноўшыя сусветныя тэхналогіі ў розных галінах эканомікі і сацыяльнай сферы; стварэнне платформы «Разумны горад» для прадстаўлення насельніцтву шырокага набору лічбавых сэрвісаў з мэтай забеспячэння камфортнага асяроддзя пражывання (на першым этапе — у 17 гарадах краіны), а таксама перавод больш за 400 адміністрацыйных працэдур у электронны выгляд. Напрыклад, плануецца перавесці ў лічбавы фармат працэсы рэгістрацыі аўтамабільнага транспарту, атрымання вадзіцельскага пасведчання, найму або арэнды жылля і г. д.

У гэтым годзе «ТІБА» прадугледжвае вельмі насычаную праграму. Нават калі вы ніяк не звязаны са сферай высокіх тэхналогій, пабываць на выставе «лічбавых дасягненняў» будзе цікава і карысна. Як заўсёды, праходзіць «ТІБА-2024» на пляцоўцы культурна-спартыўнага комплексу «Мінск-Арэна» і прадоўжыцца да 8 чэрвеня.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

## О ПОИСКЕ ПРАВООБЛАДАТЕЛЕЙ ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА

**д. Божино Березинского района Минской области**

Богушевичский сельский исполнительный комитет в целях реализации Указа Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами» разыскивает собственников, наследников и лиц, имеющих право пользования жилым домом, расположенного по адресу: Минская область, Березинский район, д. Божино (полный адрес указан согласно похозяйственных книг).

Сельисполком просит граждан, располагающих информацией о собственниках, наследниках и лицах, имеющих право пользования жилым домом, о месте их фактического проживания сообщить в Богушевичский сельисполком по телефонам: 801715 62-1-40, 801715 62-0-98, 801715 62-0-99 (с 8.00 до 17.00 по рабочим дням).

Также информацию можно прислать по адресу: 223336 Минская область, Березинский район, аг. Богушевичи, ул. Коваленка, д. 63.

Электронный адрес: boqushss@berezino.gov.by. УНП 691343420

## О ПОИСКЕ ПРАВООБЛАДАТЕЛЕЙ ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА

**д. Михалево, ул. Озерная, д. 3 Березинского района Минской области**

Богушевичский сельский исполнительный комитет в целях реализации Указа Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами» разыскивает собственников, наследников и лиц, имеющих право пользования жилым домом, расположенного по адресу: Минская область, Березинский район, д. Михалево, ул. Озерная, д. 3 (полный адрес указан согласно похозяйственных книг).

Сельисполком просит граждан, располагающих информацией о собственниках, наследниках и лицах, имеющих право пользования жилым домом, о месте их фактического проживания, сообщить в Богушевичский сельисполком по телефонам: 801715 62-1-40, 801715 62-0-98, 801715 62-0-99 (с 8.00 до 17.00 по рабочим дням).

Также информацию можно прислать по адресу: 223336, Минская область, Березинский район, аг. Богушевичи, ул. Коваленка, д. 63.

Электронный адрес: boqushss@berezino.gov.by. УНП 691343420

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

## Извещение о проведении электронных торгов в форме открытого аукциона

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607 |
| Продавец | ОАО «Минскагротранс», г. Минск, ул. Бабушкина, д. 29 |
| Оператор ЭТП | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов: производственно-складская база, расположенная по адресу: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. Тутаринова, д. 12**

Состав лота: **административное здание с пристройкой** (инв. № 640/С-25825, общ. пл. 1035,3 кв. м), **здание культурно-бытовое** (инв. № 640/С-25834, общ. пл. 370,2 кв. м), **здание ОГМ** (инв. № 640/С-25839, общ. пл. 416,1 кв. м), **мойка** (инв. № 640/С-25827, общ. пл. 48,4 кв. м), **кузница, склад** (инв. № 640/С-25823, общ. пл. 443 кв. м), **ремонтная мастерская** (инв. № 640/С-25832, общ. пл. 1220,4 кв. м), **ремонтная мастерская** (инв. № 640/С-25836, общ. пл. 1369,6 кв. м), **узел управления** (инв. № 640/С-25841, общ. пл. 68,3 кв. м), **пропускной пункт** (инв. № 640/С-110286, общ. пл. 82,8 кв. м), **наружные тепловые сети** (инв. № 640/С-110284), **элементы благоустройства** (инв. № 640/С-110291, общ. пл. 2119,1 кв. м), **автозаправочная** (инв. № 640/С-25838, общ. пл. 62,3 кв. м), **железобетонная эстакада с очистными сооружениями** (инв. № 640/С-110285, общ. пл. 84,8 кв. м), **ливневая канализация** (инв. № 640/С-110288), **металлич. эстакада для сварочных работ, 2 ед.** (инв. № 640/С-110287, общ. пл. 132,2 кв. м)

**Сведения о земельном участке**: предоставлен на праве аренды по 13.09.2066 для содержания и обслуживания зданий и сооружений автомобильного транспорта, общ. пл. 4.1160 га

**Начальная цена (с НДС 20 %) – 509 150,56 бел. руб.**
**Шаг аукциона: 5 % от начальной цены**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X. УНП 191 021 390. Получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 15** рабочих дней после проведения аукциона. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель аукциона либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **2 %** от цены продажи предмета электронных торгов в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня проведения аукциона

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 09.07.2024 с 11.00 до 12.00**. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 08.07.2024 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by.

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (44) 704-92-06, auction@cpo.by**

**Свидетельство о государственной регистрации и печать общества с ограниченной ответственностью «МайсЭкспресс» (УНП 692167122) считать недействительными в связи с утерей.**

# ИЗВЕЩЕНИЕ

**О НАЛИЧИИ ОСНОВАНИЙ ДЛЯ ПРИЗНАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА ПУСТУЮЩИМ**

Богушевичский сельский исполнительный комитет извещает, что

постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Березинского района, в ходе обследования выявлен жилой дом, расположенный по адресу: **Минская область, Березинский район, д. Михалево, ул. Озерная, д. 3** (полный адрес указан согласно похозяйственных книг), **имеющий основания для признания его пустующим.**

**Сведения о жилом доме (из акта):**

Наружные размеры одноквартирного жилого дома: 6,0*10,0 м.

Площадь: 60,0 кв. м.

Дата ввода в эксплуатацию одноквартирного жилого дома: отсутствует.

Материал стен: дерево.

Этажность: одноэтажный.

На придомовой территории не осуществляются предусмотренные законодательством мероприятия по охране земель.

Не соблюдаются требования к содержанию (эксплуатации) территории.

Сведения о лицах, включая наследников, которым предположительно одноквартирный жилом дом принадлежит на праве собственности, хозяйственного ведения или оперативного управления, иных лицах, имеющих право владения и пользования им (ей): **Знак Виктор Леонидович**.

Предположительный срок непроживания в одноквартирном жилом доме собственника, иных лиц, имеющих право владения и пользования этим домом: более 7 лет.

Богушевичский сельский исполнительный комитет просит всех заинтересованных лиц в течение двух месяцев со дня опубликования извещения уведомить Богушевичский сельский исполнительный комитет о намерении использовать пустующий дом для проживания.

Телефоны для справок: 801715 62-1-40, 801715 62-0-99, 801715 62-0-98. УНП 691343420

# ИЗВЕЩЕНИЕ

**О НАЛИЧИИ ОСНОВАНИЙ ДЛЯ ПРИЗНАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА ПУСТУЮЩИМ**

Богушевичский сельский исполнительный комитет извещает, что

постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Березинского района, в ходе обследования выявлен жилой дом, расположенный по адресу: Минская область, Березинский район, д. Божино (полный адрес указан согласно похозяйственных книг), имеющий основания для признания его пустующим.

**Сведения о жилом доме (из акта):**

Наружные размеры одноквартирного жилого дома: 6,0*5,0 м.

Площадь: 30,0 кв. м.

Дата ввода в эксплуатацию одноквартирного жилого дома: 1922 г.

Материал стен: дерево.

Этажность: одноэтажный.

На придомовой территории не осуществляются предусмотренные законодательством мероприятия по охране земель.

Не соблюдаются требования к содержанию (эксплуатации) территории.

Сведения о лицах, включая наследников, которым предположительно одноквартирный жилом дом принадлежит на праве собственности, хозяйственного ведения или оперативного управления, иных лицах, имеющих право владения и пользования им (ей): **Герасимович Мария Алиповна** (умерла 08.09.1985 г).

Предположительный срок непроживания в одноквартирном, жилом доме собственника, иных лиц, имеющих право владения и пользования этим домом: более 40 лет.

Богушевичский сельский исполнительный комитет просит всех заинтересованных лиц в течение двух месяцев со дня опубликования извещения, уведомить Богушевичский сельский исполнительный комитет о намерении использовать пустующий дом для проживания.

Телефоны для справок: 801715 62-1-40, 801715 62-0-99,801715 62-0-98. УНП 691343420

## Извещение о повторном открытом аукционе по продаже не завершенного строительством жилого дома и земельного участка в частную собственность в г. Гродно 25 июня 2024 года

| № лота | Местонахождение земельного участка, его кадастровый номер | Площадь земельного участка (га) | Характеристика (описание) не завершенного строительством капитального строения | Ориентировочные расходы по подготовке документации для проведения аукциона, руб. | Начальная цена предмета аукциона (в том числе: начальная цена не завершенного строительством капитального строения; земельного участка), руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Гродненская область, г. Гродно, ул. Сергея Гребченко, 13, У-692, микрорайон «Заболоть», 440100000002007157 | 0,0949 | Незавершенное незаконсервированное капитальное строение, степень готовности 11 %, наружная площадь 159 кв. м. Фундамент: бетонный | 344,64 | 35 882,73 (9 215,83; 26 666,90) | 7 100 |

Целевое назначение: земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Инженерные коммуникации на участке отсутствуют. Возможность подключения к внеплощадочным сетям водоснабжения, газоснабжения, электроснабжения и пр., и точки подключения определяются проектом. Земельный участок может иметь ограничения и обременения. Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона: внесение платы за предмет аукциона; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; продолжить строительство жилого дома в установленный срок.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», телефоны: + 375 (152) 626055, 626056.

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток в указанном размере, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 ГОУ № 400 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, код назначения платежа 40901, УНП 590727594 получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости»; представить в ГП «Гродненский центр недвижимости» следующие документы; заявление на участие в аукционе установленной формы; документ, подтверждающий внесение суммы задатка; подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования; дополнительно представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом негосударственного юридического лица РБ – доверенность, выданная юрлицом, документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

**Аукцион состоится 25 июня 2024 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал). Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 117 с 10 июня по 19 июня 2024 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.**

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи, не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220. Аукцион проводится аукционистом при наличии двух или более участников аукциона. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер не поднимет только один участник аукциона. Аукционист называет аукционный номер этого участника, трижды последнюю цену и объявляет о продаже предмета аукциона, а участника аукциона – победителем аукциона в отношении соответствующего предмета аукциона. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов. Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан: внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона. После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Гродненский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся. Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

## ИЗВЕЩЕНИЕ

**о проведении повторного аукциона по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов**

**Организатор:** Октябрьский сельский исполнительный комитет Логойского района Минской области.

**Дата, время и место проведения аукциона**: 18 июля 2024 г. в 10.00 по адресу: Логойский район, аг. Октябрь, ул. Центральная, д. 13, Октябрьский сельский исполнительный комитет, конт. тел.: (801774) 72 2 35, 72 2 36;
(+37544) 547-67-56. Эл. адрес: oktyabr@logoysk.gov.by

| № лота | Адрес земельного участка | Площадь участка | Инженерная инфраструктура | Начальная цена, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Затраты на организацию и проведение аукциона |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Цынное, 12А, кадастровый номер 623285806601000008 | 0,2233 га | Энергоснабжение | 2 100,00 | 420,00 | 1 439,00 (+ публикация в газете) |
| 2 | д. Городище, 8, кадастровый номер 623285801101000036 | 0,2379 га | Электроснабжение | 2 100,00 | 420,00 | 1 688,00 (+ публикация в газете) |
| 3 | д. Дрила-2, 21А, кадастровый номер 623285802101000026 | 0,2490 га | Энергоснабжение | 1 700,00 | 340,00 | 1 496,00 (+ публикация в газете) |

Прием заявлений и прилагаемых к ним документов, ознакомление с участком и документацией: ежедневно с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (кроме субботы и воскресенья) до 16 июля 2024 включительно.

Извещение о проведении повторного аукциона по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов размещено на сайтах:
1. Минского областного исполнительного комитета.
2. Минского городского исполнительного комитета.
3. Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь.
4. Логойского районного исполнительного комитета.

УНП 600181656

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

6 ЧЭРВЕНЯ 2024 г.
ЧАЦВЕР
№ 10 (15978)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

*Імёны*

## Ірына ІРШОНАК:

# «НАРОДНАЯ ПЕСНЯ ТАКАЯ МОЦНАЯ!»



Наша гераіня выконвае ўнікальныя песні. За яе плячыма — музычны каледж у Наваполацку (спецыяльнасць «Дырыжыраванне»), работа ў хоры «Рэчанька» і фальклорным ансамблі каледжа «Вербіца», выступленне з заслужаным аматарскім калектывам Беларусі — вакальна-харэаграфічным ансамблем «Камарыкі» імя Часлава Клічко Палаца культуры ААТ «Нафтан». А цяпер дзяўчына студэнтка кафедры народна-песеннай творчасці і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. У прафесійным багажы — чатыры прэміі спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, удзел у тэлевізійным шоу Андрэя Малахава «Песні ад усёй душы». Спецыяльна для «Чырвонкі. Чырвонай змены» пра спецыфіку народнай песні і свой першы сольнік расказала наша госця — спявачка, салістка Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра сімфанічна-эстраднай музыкі імя М. Я. Фінберга Ірына Іршонак.

***— Ірына, вы толькі ў пачатку свайго творчага шляху. А ўжо гэтай вясной далі першы сольнік. Раскажыце, як усё прайшло?***

— Канцэрт прайшоў цудоўна. Таму што са мной былі блізкія людзі. Мерапрыемствам займаліся прафесіяналы. Рэжысёр Ігар Крывулька — майстар сваёй справы. Яго каманда — незвычайныя людзі, якія ўсё робяць настолькі дакладна і зладжана, што нам хапіла некалькі гадзін, каб усё падрыхтаваць. Вядома, без гукарэжысёра не абышлося. Арцём Крышчановіч, прафесіянал сваёй справы, зрабіў такі гук, аб якім можа марыць кожны артыст. Усё было сакавіта, весела, задорна. Канцэрт праходзіў у цікавым фармаце. Распачаўся з аўтэнтычных песень. Першай была «Азёры» Леаніда Захлеўнага. Сама з азёрнага краю, таму захацелася пачаць з яе, тым больш напісалі сучасную аранжыроўку. Аўтэнтычныя кампазіцыі плаўна пераходзілі да песень, прысвечаных радзіме, бацькам. Спявалі папулярныя беларускія творы, савецкую класіку — словам, разнапланавая праграма. Хацелася шмат чаго ахапіць, каб паказаць, чаму навучылася падчас вучобы на кафедры народна-песеннай творчасці і фальклору. Удзячна ўніверсітэту за тое, што далі магчымасць зрабіць сольны канцэрт. Таму што ў 22 гады можна толькі марыць аб сольніку, а пра тое, каб сабраць залу — і думаць не магла *(усміхаецца)*. Упэўнена, гэтая падзея дасць добры старт маёй далейшай кар'еры.

***— Ірына, а якія знакамітасці былі сярод гасцей?***

— Вядома, без гасцей канцэрт не абышоўся. У ім прымалі ўдзел заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Валерый Шмат. Ён напісаў песню «Зязюля», якую я выконвала. Выступалі ВІА «Чараўніцы». З імі выканала «Пах чабаровы», таму што гэта была мара яшчэ з часоў студэнцтва ў каледжы. Калісьці ўбачыла дзяўчат на канцэрце і не магла ўявіць, што буду з імі знаёмая, не тое каб праспяваць разам на адных падмостках ды яшчэ і саліраваць. Але жыццё — дзіўная рэч. Адбываюцца крутыя павароты.

***(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)***

*Час маладых*

## Рыцары інфармацыі

У Беларускім дзяржаўным універсітэце прайшлі спаборніцтвы праграмістаў, дзе сем каманд сталічных універсітэтаў вырашалі практыкаарыентаваныя задачы па інфармацыйнай бяспецы. Правесці алімпіяду па названай тэме сярод студэнтаў ВНУ (арганізатарам яе выступае Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь) — рашэнне своечасовае і актуальнае, бо ў сённяшніх рэаліях інфармацыйная бяспека з'яўляецца тым падмуркам, які забяспечвае нацыянальную абарону краіны.



— Айчынны рынак інфармацыйных тэхналогій вельмі зацікаўлены ў маладых, таленавітых спецыялістах. Менавіта таму прыемна бачыць сярод удзельнікаў алімпіяды найлепшых прадстаўнікоў вядучых універсітэтаў Беларусі, — такімі словамі вітаў удзельнікаў «Security challenge» **першы намеснік міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь Аляксандр БАХАНОВІЧ.**

На інтэлектуальныя спаборніцтвы свае каманды вылучылі найлепшыя ВНУ сталіцы, а ў камандах сабраліся найлепшыя прадстаўнікі гэтых універсітэтаў у галіне інфармацыйнай бяспекі. **Першы прарэктар БДУ Дзмітрый КУРЛОВІЧ** падкрэсліў, што такая канкурэнцыя матывуе ўдзельнікаў на перамогу, памнажае вопыт для іх далейшай прафесійнай дзейнасці. Ён выказаў спадзяванне, што ў будучыні алімпіяда можа набыць статус міжнароднай.

Зборныя каманды на працягу васьмі гадзін вырашалі заданні па праверцы на базавыя веды мовы праграмавання Python, дэманстравалі навыкі валодання прыладай версіявання Git, работы з блакнотамі Jupyter, а таксама стварэння серверных вэб- і шматпрацэсных дадаткаў, чэргаў для перадачы паведамленняў і іншыя.

Перад пачаткам спаборніцтваў хлопцы дзяліліся сваімі адчуваннямі. **Студэнт трэцяга курса ФПМІ Арцём ГАЛЯН** лічыць алімпіяду не толькі сур'ёзнай праверкай ведаў, але і добрай магчымасцю праявіць свае навыкі, умацаваць упэўненасць у сабе і матываваць ісці наперад. Каманда, паводле слоў яе ўдзельнікаў, рыхтавалася да спаборніцтваў сур'ёзна, удумліва і адказна. І вынік не прымусіў сябе чакаць — Кубак «Security challenge»! На другой ступені п'едэстала — каманда БДУІР і яе ўдзельнікі — студэнты факультэта інфармацыйнай бяспекі, а «бронза» дасталася зборнай БДТУ са студэнтаў факультэта інфармацыйных тэхналогій.

Усе ўдзельнікі алімпіяды ў поўнай меры прадэманстравалі свае даследчыя навыкі, нетрывіяльнае мысленне і веды ў галіне інфармацыйнай бяспекі. У працэсе спаборніцтваў было два блокі: тэарэтычны, дзе правяраліся ўжо існуючыя навыкі, і практычны, дзе канкурсанты дэманстравалі, наколькі яны гатовы да выклікаў сучаснасці, сутыкнуўшыся з канкрэтнымі задачамі і праблематыкай абароны інфармацыі.

## Як прайшлі «Адкрытыя веды» ў Мінску

Інфармацыйна-асветніцкі праект «Адкрытыя веды» па тэме «Беларусь будучыні» прайшоў у Мінску ў гандлёвым цэнтры «Сталіца». У мерапрыемстве прынялі ўдзел больш за 600 маладых людзей, яшчэ каля 800 студэнтаў і навучэнцаў горада далучыліся з дзевяці студый, якія працавалі ў рэжыме відэа-канферэнц-сувязі.




— Грандыёзны праект «Беларусь будучыні» — гэта цудоўная магчымасць данесці да нашага пакалення той складнік нашай краіны, які існуе сёння, пагаварыць пра планы на заўтра і ўвогуле паказаць моладзі, што ў Беларусі ёсць шмат усяго, што маладыя людзі павінны захаваць і, вядома ж, прымножыць, — адзначыў падчас мерапрыемства адзін са спікераў, **намеснік начальніка ўпраўлення аэракасмічнай дзейнасці НАН Рэспублікі Беларусь Іван БУЧА.**

Яскравым было таксама выступленне **генеральнага дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Вадзіма ГІГІНА.** Ён засяродзіў увагу на праектах, якія робяць самае вялікае кніжнае сховішча ў краіне больш даступным для любога карыстальніка.

— Працуем над тым, каб у цэлы шэраг нашых памяшканняў не быў патрэбны чытацкі білет, каб гэта было максімальна адкрытае асяроддзе, якое дазволіць арганізаваць інтэлектуальны вольны час. Спадзяюся, у наступным годзе ўбачыць першы паверх бібліятэкі стане безбар'ерным, — заявіў ён.

Асабліва хвалявалі моладзь пытанні штучнага інтэлекту. Сваім меркаваннем на гэты конт падзяліўся **намеснік начальніка Сакратарыята Назіральнага савета Парка высокіх тэхналогій Кірыл ЗАЛЕСКІ.** Паводле яго слоў, штучны інтэлект у адным месцы адбірае працоўныя месцы, у іншым стварае іх.

— Нейкія прафесіі сыдуць, іншыя, якія патрабуюць інтэлектуальнай падрыхтоўкі і самаразвіцця, прыйдуць. Патрэбны будуць не працоўныя рукі, а працоўныя галовы, — заключыў ён.

Прыемным дадаткам да мерапрыемства стала выступленне творчых калектываў сталіцы, а таксама розныя выставы, сярод якіх «100 ідэй для Беларусі», інавацыйныя распрацоўкі студэнтаў БДУ і БДУІР, праекты навучэнцаў Мінскага гарадскога палаца дзяцей і моладзі.

# «НАРОДНАЯ ПЕСНЯ ТАКАЯ МОЦНАЯ!»

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Прымала ўдзел у канцэрце і Святлана Бударына — вакаліст канцэртнага аркестра Рэспублікі Беларусь імя М. Я. Фінберга. Мы выконвалі дуэт «Па-над белым пухам вішняў». Прайшло ўсё цудоўна, ярка, весела. Было шмат моладзі. Таму веру, што народная песня ўсё ж такі праб'е непахісную сцяну, якая не прапускае ў шырокія масы народную музыку. Мы на правільным шляху! Зала танчыла і весялілася, плакала і смяялася — было ўсё. Здаецца, увесь спектр эмоцый захапіла. Гэта для мяне вельмі важна. Усё атрымалася!



***— Давайце пагаворым аб крыніцы натхнення. Напэўна, гэта ваша радзіма?***

— Нарадзілася я на Віцебшчыне, у пасёлку Варапаева. Наша Паазер'е, Браслаўскія азёры, што блізка, — гэта ўсё настолькі захапляе! Прыкіпела ўсёй душой да гэтага куточка. І хочацца паказваць прыгажосць роднага краю ў песнях. Вакол такое хараство прыроды і не трэба нікуды ехаць! Галоўнае — гэта заўважыць, я гэта ўбачыла вельмі рана.

У сям'і нас трое — з братам і сястрой розніца ў дзесяць гадоў. Старэйшы брат адвучыўся ў мясцовай музычнай школе два класы. І сястра таксама яе скончыла. Баян па чарзе перайшоў да мяне. Настаўнікі параілі паспрабаваць спяваць.

***— Раскажыце, калі ласка, з чаго пачаўся творчы шлях?***

— З першага конкурсу «Пастаўскія зорачкі». Ездзіла туды пяць разоў, пакуль не перамагла *(смяецца)*. Дзякуй педагогам — Валянціне Мікалаеўне Тамазанавай і Ірыне Валянцінаўне Козел. Яны паверылі ў мяне. Памятаю, Валянціна Мікалаеўна адразу сказала, што голас у мяне народны. Мне вельмі прыемна, што цяпер аднакурснікі слухаюць маю «Ягадку-малінку» і «Калітку».

***— Дарэчы, а хто напісаў тэкст да песні «Калітка»?***

— Мой дзядзька Міхась Кожух. Ён выкладчык беларускай мовы. Бязмерна ганаруся сваім таленавітым родзічам. Музыку прыдумаў Сяргей Ждановіч. Гэта мой прадзюсар, а яшчэ музыкант і рэжысёр. У Сяргея Эдуардавіча столькі праектаў!

***— Якія конкурсы былі найбольш адказнымі?***

— Я ўладальніца чатырох узнагарод спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Напэўна, трэба ісці па пятую *(смяецца)*. Запомніўся фестываль-конкурс хрысціянскай народнай песеннай культуры «Опцінская вясна» ў Казельску. Жыць у манастыры Опцінай пустыні было проста неверагодна! Важным быў конкурс "Як на рэчцы было на Фантанцы" ў Санкт-Пецярбургу. Узяла лаўрэацтва другой ступені. Атрымала першую імянную стыпендыю. На трэцім курсе ўніверсітэта паехала туды другі раз і ўзяла не толькі першае месца, але і спецыяльны прыз — залатыя завушніцы ад рэктара. Ён пажадаў надзець завушніцы на першы мой сольны канцэрт. І ўсё яшчэ не верыцца, што гэта адбылося! Запомніўся трэці, важны ў маім жыцці радыёконкурс «Маладыя таленты Беларусі». Вельмі ўдзячна арганізатару Таццяне Якушавай. Конкурс даў мне чароўны штуршок, каб рухалася далей і не спынялася.

***— Ірына, падзяліцеся, як удалося трапіць на тэлешоу да Андрэя Малахава?***

— Я пастаянна займаюся з выкладчыкамі па пастаноўцы голасу — з Ларысай Віктараўнай Снапковай і з заслужанай артысткай Рэспублікі Беларусь Наталляй Міхайлаўнай Раманскай. Падчас аднаго з такіх заняткаў мне патэлефанавалі з рэдакцыі Андрэя Малахава. Запрасілі на перадачу «Песня ад усёй душы». Было нечакана. Яны ўбачылі мой кліп і песню «Калітка». Праз тыдзень-другі, калі я ляжала дома хворая, паведамілі, што заўтра здымкі. Мы пачалі збірацца. Вечарам таго ж дня паехалі ў Варапаева рабіць рэпартаж. Маю хваробу як рукой зняло. У Маскву са мной паехала мама. Яна была ў такім захапленні! На здымках праграмы разам з усімі і плачаш, і смяешся. На час эфіру ўсе ўдзельнікі сталі як адна сям'я. Там адбываецца нейкая магія!

***— Акрамя вучобы, вы яшчэ працуеце ў аркестры...***

— Працую ў канцэртным аркестры сімфанічна-эстраднай музыкі імя М. Я. Фінберга. Туды трапіла нядаўна, шчасцю майму няма межаў. Быць у камандзе з такімі прафесіяналамі — вялікі гонар. Можа здацца, што народная песня і саксафон, труба, віяланчэль гучаць дзіўна. Але мы неяк знаходзім рашэнні.

***— Сёлета Беларусь адзначае 80-годдзе вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Ці ёсць песні ваеннай тэматыкі ў вашым рэпертуары?***

— Песня Людмілы Зыкінай «Памятаюць людзі». Пра моцную беларускую дзяўчыну, якая змагла адстаяць палоннага грузінскага салдата. Кожны раз, калі выконваю яе, — па целе дрыжыкі. Пражываю гісторыю са слязамі на вачах.

Мая бабуля па бацькавай лініі Марыя Емяльянаўна перажыла вайну. Яна 1928 года нараджэння, са Смаленска. Адна гісторыя, расказаная ёй, вельмі ўрэзалася ў памяць. Іх, юных людзей, прывялі да сцяны. Далі сказаць апошнія словы перад расстрэлам. І раптам дзесьці далёка рускі салдат пачаў страляць, каб адпудзіць немцаў. Ён выратаваў наш род. Сёння з маіх вуснаў гучыць песня, а значыць, жыццё працягваецца.

Дзякуючы песні «Памятаюць людзі» стала пераможцай другога сезона фестывалю «Вытокі». Народная песня такая моцная, кожнаму ў душу зойдзе! Фестываль даў чароўны старт і адкрыў для мяне шмат дзвярэй.

***— Што пажадаеце нашым чытачам ў гэты святочны час?***

— Яшчэ калі была маленькай, памятаю, кожны год хадзілі да манументаў, ускладалі кветкі да магілы абаронцаў. Паглядзіце, якая цяпер у нас цудоўная сталіца! Уяўляеш, што на гэтым месцы было 80 гадоў таму і дзівішся: горада практычна не існавала. А цяпер мы замілаваны ўсім вакол! У думках удзячна гэтым простым людзям, героям, якія здзейснілі незвычайны подзвіг. Таму шануйце мірнае неба над галавой! Любіце музыку і сваю краіну!

**Надзея ЗУЕВА.**
**Фота з уласнага архіва спявачкі і Ірэны ГУДЗІЕЎСКАЙ.**

*Узаемадзеянне*

# УСЕ ЎМОВЫ ДЛЯ РАЗВІЦЦЯ

На мінулым тыдні ў Смалявічах падвялі вынікі абласнога конкурсу «Малады лідар Міншчыны». У той жа час адбылося пасяджэнне Мінскага абласнога савета працоўнай моладзі пры Мінскім абласным выканаўчым камітэце. Карэспандэнт «ЧЗ. Чырвонай змены» наведаў горад-спадарожнік і даведаўся, чым жыве моладзь цэнтральнага рэгіёна.

Сёння маладыя людзі Міншчыны маюць усе ўмовы для развіцця. І стала ўжо добрай традыцыяй праводзіць штогод абласны конкурс «Малады лідар Міншчыны». Ён накіраваны на папулярызацыю дасягненняў моладзі, яе інавацыйных ідэй, перадавога вопыту, стымуляванне творчай працы і прызнанне дасягненняў у вытворчай і грамадскай дзейнасці. Выяўляюцца самыя ініцыятыўныя, таленавітыя маладыя лідары.

Кіраўніцтва рэгіёна арыентавана на прыцягненне маладых талентаў да актыўнай грамадскай дзейнасці і стварэнне ўмоў для іх прафесійнага росту. Адказнасць, самастойнасць і ініцыятыва — галоўныя рысы маладога пакалення. Падтрымаць маладых і таленавітых прыйшлі намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Вольга Топдэмір, намеснік старшыні Смалявіцкага райвыканкама Ірына Кананові́ч, а таксама члены Мінскага абласнога савета працоўнай моладзі і маладыя ўдзельнікі Усебеларускага народнага сходу. Узнагароджанне пераможцаў абласнога конкурсу праходзіла на базе сярэдняй школы № 5 горада Смалявічы. Там удзельнікі мерапрыемства пазнаёміліся з выставай, дзе былі прадстаўлены праекты па рэалізацыі маладзёжнай палітыкі. У выставе прынялі ўдзел Мінская абласная арганізацыя БРСМ, прадпрыемствы і ўстановы Смалявіцкага, Барысаўскага раёнаў і горада Жодзіна.

— З кожным годам абласны конкурс «Малады лідар Міншчыны» набірае ўсё большыя абароты, узрастае колькасць яго ўдзельнікаў, — распавяла журналістам **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Вольга ТОПДЭМІР**. — Імкнёмся да таго, каб нашай моладзі працавалася лепш, жылося больш камфортна. Праекты і ідэі, якія прадстаўлены на конкурсе, максімальна спрабуем укараніць.

Невыпадкова быў абраны і Смалявіцкі раён. «Смалявічы — выдатны горад-спадарожнік, у ім канцэнтруецца моладзь, бо тут ёсць развітая інфраструктура», — адзначыла Вольга Топдэмір.

Паводле яе слоў, старшыня Мінскага абласнога выканаўчага камітэта ўдзяляе вялікую ўвагу развіццю і падтрымцы таленавітай моладзі. Аляксандр Турчын бачыць маладзёжныя праекты і максімальна імкнецца іх падтрымліваць.

— На конкурсе прадстаўлены практычна ўсе сферы жыццядзейнасці, пачынаючы ад адукацыі, ахова здароўя, заканчваючы аховай правапарадку. Вельмі радуе, што маладзёжныя праекты практыка-арыентаваныя і рэалізоўваюцца ў арганізацыях і на прадпрыемствах. Гэта аб'ядноўвае моладзь, — падкрэсліла прадстаўніца аблвыканкама. — Сёння мы задаліся мэтай пашырыць рамкі ўзаемадзеяння менавіта з рабочай моладдзю. Мы разумеем, што ў маладых людзей свая работа, паўсядзённыя клопаты, сем'і, нараджаюцца дзеці. З-за чаго ў іх не заўсёды атрымліваецца займацца грамадскай дзейнасцю, але пасыл і жаданне ёсць. Таму стараемся ствараць магчымасці для рэалізацыі гэтых жаданняў.



На ўдзел у абласным конкурсе паступіла больш за 30 заявак ад маладых людзей ва ўзросце ад 21 да 31 года з розных сфер дзейнасці. Па выніках спаборніцтва былі агучаны імёны пераможцаў у дзесяці намінацыях. Так, **маладым лідарам Міншчыны ў сферы навуковай дзейнасці стала Яна ШВЕД**. Вось ужо трэці год яна працуе настаўнікам хіміі і біялогіі ў сярэдняй школе № 3 горада Крупкі. Вучылася ў БДПУ імя М. Танка, сёлета скончыла магістратуру.

— Мне, як маладому вучонаму і настаўніку, хочацца зрабіць свой уклад у развіццё нашай краіны. Таму я матывую дзяцей да вучобы, да вывучэння хіміі. Распрацавала электронны адукацыйны рэсурс, які другі год паспяхова рэалізоўваю не толькі ў нашай установе адукацыі, але і ў іншых школах раёна. Для мяне вялікі гонар прысутнічаць тут і стаць пераможцам, — дзеліцца Яна Швед.

Па словах маладога лідара Міншчыны, школа, у якой яна працуе, — самая вялікая ў раёне. У ёй вучыцца каля 645 дзяцей. Установа адукацыі нядаўна адсвяткавала сваё 35-годдзе. «Калі я прыйшла ў школу ў якасці маладога спецыяліста, цешыла падтрымка адміністрацыі і калег. І перад гэтым мерапрыемствам зайшла ў школу. Дзеці за мяне перажываюць. Для мяне гэта вельмі ганарова. Важна бачыць, што ім патрэбна і падабаецца хімія. Я бачу агонь у іх вачах. А калі яны радуюцца сваім перамогам, я радуюся разам з імі», —дадала Яна Швед.

— Сёння я глядзеў на пераможцаў конкурсу збоку, — распавёў **член Рэспубліканскага савета працоўнай моладзі Андрэй МАРОЗАЎ**. — А летась сам удзельнічаў у конкурсе, стаў пераможцам у сферы адукацыі. Натуральна, гэта конкурс адзін з лепшых. Вылучыцца на такім важным мерапрыемстве вельмі прэстыжна.

Андрэй Марозаў — настаўнік гісторыі з аграгарадка Лошніца Барысаўскага раёна. Летась ён удзельнічаў з праектам патрыятычнага і краязнаўчага кірунку: «Мы распрацавалі віртуальны сайт, дзе ахапілі ўвагай усе аспекты жыцця аграгарадка. Тут можна знайсці гістарычныя і актуальныя падзеі. Сайт функцыянуе і развіваецца, кожны дзень напаўняецца новай інфармацыяй». Педагог перакананы, што попыт на гісторыю будзе заўсёды, а на гісторыю сваёй краіны — найперш.

Пасля ўзнагароджання для пераможцаў і ўдзельнікаў конкурсу зладзілі экскурсію, падчас якой распавялі пра гісторыю Смалявіцкага раёна. Завяршылася мерапрыемства ўскладаннем кветак да п'едэстала мемарыяльнага комплексу «Курган Славы».

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ,**
**фота аўтара.**
*г. Смалявічы.*

*Вітражы майстэрства*

# Дзяліцца вопытам на роўных,

## або Як курсанты стварылі гурток па авіямадэляванні

**Пошук цікавых герояў і нестандартных выкладчыкаў завёў нас у Беларускую дзяржаўную акадэмію авіяцыі. Менавіта там мы пазнаёміліся з двума курсантамі Аляксандрам БАРАНАВЫМ і Антонам ДЗЯМКО, якія ўжо год выкладаюць у гуртку па авіямадэляванні.**





З'яўленне гуртка — ініцыятыва Аляксандра Баранава.

— Яшчэ з 1 курса я быў зацікаўлены ў тым, каб адкрыць у акадэміі авіямадэляванне. У выніку, калі ўжо быў на трэцім курсе, нам вылучылі месца і дазволілі весці гурток, — дзеліцца малады чалавек.

Паводле яго слоў, авіямадэляванне — гэта асноватворны складнік любой авіяцыйнай спецыяльнасці, бо падчас заняткаў курсанты не толькі працуюць рукамі, але і вывучаюць будову самалёта.

Сам Аляксандр займаецца авіямадэляваннем ужо вельмі даўно.

— Мне было гадоў шэсць, калі я ўпершыню трапіў у лабараторыю. Павольна, але ўпэўнена пачаў займацца гэтай справай. Прызнаюся, не ўсё з першага разу атрымлівалася. Тым не менш да 10 гадоў мяне ўжо пачалі вазіць на спаборніцтвы, — успамінае ён.

Дарэчы, акрамя авіямадэлявання малады чалавек займаўся яшчэ рознымі цікавымі тэхнічнымі напрамкамі — такімі, як ракетамадэлізм, суднамадэлізм і аўтамадэлізм. І хлопец дасягнуў немалых вяршынь: напрыклад, на дадзены момант ён — майстар спорту Рэспублікі Беларусь па суднамадэльным спорце.

Другі выкладчык Антон Дзямко сёлета выпусціцца з альма-матар і стане дыпламаваным авіямеханікам.

— Яшчэ да паступлення ў акадэмію авіяцыі сам займаўся ў авіямадэльным гуртку ў Мінскім дзяржаўным палацы дзяцей і моладзі, там жа атрымаў свой першы вопыт у выкладанні. І тое шмат у чым абумовіла мой выбар прафесіі, — дзеліцца Антон Дзямко.

Вядома, пасля паступлення ў ВНУ малады чалавек не змог забыць сваё любімае хобі.

— Як толькі зразумеў, што ў мяне ёсць аднадумцы, якія хочуць стварыць авіямадэльны гурток у нашай акадэміі, то з радасцю падтрымаў гэтую ідэю і пагадзіўся дапамагчы, — успамінае ён.

На яго думку, авіямадэляванне, як і любы іншы напрамак тэхнічнай творчасці, дапамагае развівацца.

— Курсанты пачынаюць знаёміцца з інструментамі, вучацца працаваць рукамі і прымяняць на практыцы веды, якія ім даюць у школе. Напрыклад, яны не ведаюць, навошта ім чарчэнне, а тут без яго асноўных прыёмаў ніяк, — расказвае Антон Дзямко.

Авіямадэляванне — гэта не толькі кірунак тэхнічнай творчасці і спорту, але і ўклад у развіццё канструктарскай базы Саюзнай дзяржавы. Акрамя гэтага, у БДАА вядзецца распрацоўка лабараторый авіярухавікабудавання і плануецца адкрыццё новай спецыяльнасці па падрыхтоўцы авіяканструктараў у 2025 годзе.

Як жа праходзяць заняткі ў гуртку па авіямадэляванні?

— Першыя некалькі заняткаў прысвечаны ўступнай тэарэтычнай падрыхтоўцы. Перад выкладчыкам стаіць задача растлумачыць матэрыял, які праходзяць студэнты старэйшых курсаў, — дзеліцца Антон Дзямко.

Далей выдаюцца чарцяжы мадэлі, па прыкладзе якіх курсанты ствараюць уласны чарцёж. Толькі пасля гэтага яны атрымліваюць нарыхтоўкі і пераходзяць да вырабу дэталяў і састаўных частак.

Усяго гурток наведвае 24 чалавекі, дзве групы. Сярод іх — курсанты як з аддзялення сярэдняй спецыяльнай адукацыі, так і з факультэта грамадзянскай авіяцыі. Заняткі праходзяць два разы на тыдзень.

Па словах Антона Дзямко, калі чалавек спраўна працуе і рэгулярна наведвае заняткі, то першы свой самалёт (самы просты кідальны планёр) можа зрабіць усяго за два тыдні. Для больш сур'ёзных мадэляў спатрэбіцца часу больш. Так, праца ад чарцяжа да фінальнага самалёта можа заняць каля паўгода.

Сумяшчаць вучобу і выкладанне няпроста, аднак Антон Дзямко перакананы, што ўсе намаганні акупляюцца шматразова ў тым ліку і ў плане асабістай матывацыі.

— Як курсант вывучаю тэмы, якія дастаткова блізка стаяць з тэмамі авіямадэлявання па асноўным курсе. Атрымліваецца, што абавязаны ва ўсім разабрацца настолькі добра, каб патлумачыць іншым. Ты ніколі не можаш узяць і прапусціць нейкую тэму. Наадварот, заўсёды павінен быць пільны, каб ніхто не мог усумніцца ў тваім прафесіяналізме, — разважае малады чалавек.

Да таго ж гэта добрая практыка ў выкладчыцкай справе, бо знайсці індывідуальны падыход да кожнага — задача не з лёгкіх.

— Ва ўсіх розныя здольнасці. Хтосьці прыйшоў з вялікім багажом ведаў, хтосьці — з меншым. Важна да ўсіх ставіцца аднолькава і не ўзносіць асобных курсантаў над іншымі, — дзеліцца Антон Дзямко. — Калі чалавек дасягнуў пэўных поспехаў за больш кароткі тэрмін, гэта абавязкова трэба пазначыць перад усімі. Але разам з тым і ўсіх астатніх таксама трэба падцягваць да такога ж узроўню. Гэта стварае здаровую канкурэнцыю і спартыўную цікавасць.

У сваю чаргу Аляксандр Баранаў лічыць, што ў выкладанні самае галоўнае — выйсці на даверныя адносіны паміж выкладчыкам і курсантам:

— Так будзе прасцей даносіць нейкую інфармацыю і тлумачыць матэрыял.

Абодва хлопцы з такім захапленнем расказвалі аб авіямадэльным гуртку, што ў нас узнікла пытанне: а ці не хочуць яны звязаць сваё жыццё з выкладаннем? І яны ў адзін голас адказалі, што зробяць усё магчымае, каб застацца ў альма-матар у якасці педагогаў.

— Каб ісці непасрэдна ў авіяцыйную сферу, трэба вельмі моцна гарэць гэтым і разумець, якую адказнасць ты на сябе будзеш ускладаць. Зыходзячы з гэтага, магу зрабіць выснову, што я не інжынер, мне больш падабаецца педагогіка і выкладанне, — заключыў Аляксандр Баранаў.

А вось Антон Дзямко ўжо даўно зрабіў выбар і сёлета плануе размеркавацца ў БДАА і прадоўжыць весці авіямадэльны гурток.

**Лізавета ГОЛАД,**
**фота аўтара.**







*Асабісты выбар*

# МАСТАЦТВА БАРБЕРЫНГУ

У свеце існуе мноства прафесій на любы густ. Галоўная задача кожнага чалавека — знайсці тую, якая не толькі будзе прыносіць добры прыбытак, але і задавальненне. Пра тое, з якімі тонкасцямі ў рабоце сутыкаецца магілёўскі барбер Мікіта ГРУДЗІНАЎ, даведаўся карэспандэнт «ЧЗ.Чырвонай змены».



Барбер з'яўляецца свайго роду ўзорам стылю, экспертам, які добра арыентуецца ў сучасных модных прычосках. Назваўшы такога майстра цырульнікам, можна яго нават абразіць.

— Барбераў і цырульнікаў аб'ядноўвае тое, што яны займаюцца адной і той жа добрай справай — стрыгуць людзей. Адзінае адрозненне паміж барбершопамі і іншымі падобнымі месцамі — канцэнтрацыя першых пераважна на мужчынскіх стрыжках і галенні, і таксама ў асаблівай атмасферы. Аднак апошнім часам сфера відазмяняецца, нярэдка і жанчын можна ўбачыць у шэрагу кліентаў нашай установы, і гэта не проста так: барберы сталі рабіць жаночыя стрыжкі лепш, чым у салонах прыгажосці.

У барбершопе стрыжка абыходзіцца ў разы даражэй, чым у любой іншай цырульні, — гэта звязана з наяўнасцю прафесійнага абсталявання ў кожнага спецыяліста. Наўрад ці падобныя рэчы вы сустрэнеце ў звычайных салонах прыгажосці. У дадатак да гэтага барбершопы могуць пахваліцца сапраўды прыязнай мужчынскай атмасферай.

— Тут можна пажартаваць, пасмяяцца, абмеркаваць з майстрам асабістыя праблемы. Калі кліенту трапіцца добры барбер, ён з ім абавязкова пра нешта пагаворыць. У барбершопах усё зроблена таксама для таго, каб кліент адпачыў. У кошт стрыжкі ўключаны выдатная музыка, кубачак кавы, любімыя гульні на PlayStation і добры настрой.

У барбершопах працуюць, як правіла, маладыя хлопцы, якія гараць гэтай справай, пастаянна развіваюцца ў абранай прафесіі. Часцяком яны сюды прыходзяць адразу пасля школы, хоць ёсць і тыя, хто мае вышэйшую адукацыю, не звязаную з барберынгам.

— У прафесію я прыйшоў абсалютна выпадкова. Заканчваючы школу, ніяк не мог вызначыцца, чым займацца далей. Хацелася рабіць штосьці, што абуджала б сапраўдны інтарэс. Аднойчы разам з сябрам схадзіў на стрыжку да барбера. Мне спадабалася, як ён стрыжэ, як абыходзіцца з нажніцамі і машынкай. Таксама быў уражаны яго ўменнем узаемадзейнічаць з кліентам. Тады зразумеў, што вось яна — прафесія, дзе я буду атрымліваць сапраўднае задавальненне. І гэтая думка не пакідала.

Што датычыцца адукацыі, неабавязкова заканчваць каледж — дастаткова прайсці курсы, якія доўжацца ўсяго некалькі месяцаў. Існуюць заняткі як бюджэтныя, так і дарагія. Бонусам да паспяховай здачы экзамену многія барбершопы працаўладкоўваюць сваіх студэнтаў у свае ўстановы.

— Веды ў гэтай прафесіі могуць быць не падмацаваны дыпломам, таму што існуюць выдатныя майстры-самавукі. На курсах навучэнец атрымлівае падмурак, на якім далей можа расці як майстар. Дарэчы, з гэтым наборам навыкаў можна працаваць у любой краіне свету. Навучанне на курсах — працэс не з лёгкіх. Усюды ёсць свае цяжкасці, галоўнае — іх пераадолець. Цяпер я стрыгу, атрымліваю асалоду ад гэтага, а кліенты, у сваю чаргу, атрымліваюць радасць ад выніку маёй працы.

Пасля заканчэння курсаў юнага спецыяліста чакае наступны, не менш важны, крок — падабраць неабходны інвентар для стрыжкі. Велізарная колькасць спецыяльных інструментаў — на паліцах крам або маркетплэйсаў, аднак барберу-пачаткоўцу дастаткова ўсяго некалькіх прыбораў.

— Каб пачаць стрыгчы, на першы час досыць машынкі, нажніц і расчоскі. З гэтым базавым наборам ужо можна зрабіць практычна любую стрыжку. Далей, калі малады чалавек расце як майстар, падбірае пад сябе дадатковыя прылады, — лічыць суразмоўца.

Па словах Мікіты, барберы — гэта вялікая сям'я, у якой усе адзін аднаго падтрымліваюць, дзеляцца парадамі ў галіне барберынгу і не толькі.

— Мы, у адрозненне ад цырульнікаў, не ўспрымаем калег канкурэнтамі. Кожны з нас займаецца адной агульнай добрай справай. У некаторых выпадках, дзякуючы нашаму ўзаемадзеянню з іншымі барберамі, пераймаем досвед адзін аднаго і ўдасканальваем свае навыкі.

Паколькі барберынг — работа з людзьмі, ёсць фактары, якія зусім не імпануюць майстрам:

— Больш за ўсё барберам непрыемныя спазненні і адмены запісаў за некалькі хвілін да стрыжкі. Адна справа, калі кліент загадзя папярэдзіць і своечасова адменіць запіс. І ў выпадку разавага спазнення майстар нічога не скажа, аднак калі чалавек будзе спазняцца пастаянна, пра яго зробяць адпаведныя высновы. Лічу, таксама перад візітам у барбершоп варта прыняць душ або банальна памыць галаву. Мне здаецца, усе людзі хочуць, каб да іх ставіліся паважліва, барбер — не выключэнне.

**Яўгеній КСЯНДЗОЎ.**

*На заметку*

# Уратаваць свет творчасцю...

«Мастацтва павінна працаваць на стварэнне, на памнажэнне прыгажосці ў нашым свеце» — такой думкі прытрымліваюцца ўдзельнікі і арганізатары міжнароднага праекта «Саярсізм», які прайшоў у Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў. У экспазіцыі было прадстаўлена больш за 70 работ жывапісу, графікі і скульптуры — яны прадстаўлялі гледачу ілюстрацыю саярсізму ў розных тэхніках ад мастакоў з васьмі краін свету.

Саярсізм — кірунак у сучасным мастацтве, і прыхільнікі характарызуюць яго як «новую хвалю рускага авангарда». Саярсічная тэорыя прапануе новую сістэму разумення мастацкай абстракцыі, у якой квадрат — гэта думка, кола — пачуццё, трохвугольнік — інтуіцыя, а больш складаныя фігуры, вобразы і формулы, адпаведна, — больш складаныя элементы свядомасці. Асаблівасць стылю ў тым, што яму ўласціва поўная ўніверсальнасць, у якой можна выкарыстоўваць рэалістычныя і абстрактныя мастацкія элементы, знакі, апісанні, агульныя ці ўласныя мастацкія рашэнні.

— Гэтая выстаўка — сведчанне, што мы стаім на парозе вялікага шэсця сучаснага мастацтва, народжанага ў Расіі, дзе некалі з'явіўся супрэматызм, канструктывізм, футурызм. І я хачу падкрэсліць, што наш праект дазволіць нам з часам — выстаўка за выстаўкай — сфарміраваць асяроддзе, куды будуць далучацца новыя мастакі, — падзяліўся **дырэктар Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў Рэспублікі Беларусь Сяргей КРЫШТАПОВІЧ.** — Калі ў XX стагоддзі Беларусь і Расія далі свету Казіміра Малевіча, Марка Шагала, то сёння, спадзяюся, мы таксама зробім падобнае. І застанёмся ў кантэксце гэтай падзеі сярод людзей, якія змяняюць ход сусветнага мастацтва XXI стагоддзя...

Аўтарам канцэпцыі саярсізму стаў мастак Сяргей Дождж, і базіруецца гэты кірунак на спалучэнні навукі і мастацтва:

— Гэта навуковая абстракцыя. Заснавальнікі абстракцыі, гісторыя якой налічвае каля ста гадоў, стварылі абстрактнае мастацтва, але не патлумачылі, як абстрагавацца. А навуковая абстракцыя — калі мастакі ствараюць абстрактныя карціны, тлумачачы іх адзін аднаму і гледачу. Гэта тое ж, што мы робім у абстрактнай прасторы матэматыкі, фізікі ці квантавай механікі, — распавядае **мастак, кандыдат мастацтвазнаўства, ганаровы член Расійскай акадэміі мастацтваў Сяргей ДОЖДЖ.** — У тэорыі саярсізму мастацтвазнаўчыя паняцці фарміруюць новую прастору мастацтва. Напрыклад, у рэалістычным жывапісе ёсць такое паняцце, як «перспектыва», а ў навуковай абстракцыі мы бачым, як яна змяняе сваё значэнне. Калі ў рэалістычным мастацтве тое, што далей, больш цьмянае, то ў навуковай абстракцыі бліжэй тое, што выклікае ў нас большы інтарэс... Яшчэ мы пачынаем актыўна развіваць сваю ўнутраную прастору. Змяняецца поўнасцю разуменне самой тэорыі творчасці. Яна становіцца пластычнай і бязмежна цікавай: мастак атрымлівае бясконцую пластыку на палатне і ў свядомасці. І крыніцай творчасці з'яўляецца ўжо наша творчае асяроддзе. Дадзеныя філасофскія абагульненні ў выніку выліваюцца ў філасофію творчасці, якая мае магутны ўплыў на чалавека і яго творчы патэнцыял.



Філасофія творчасці тут заснавана на тым, што магчыма абсалютна бясконцае творчае развіццё людзей, навакольнага свету. Ствараючы прыгажосць, мы ствараем — такі асноўны прынцып дадзенай тэорыі. Адначасова гэта можа аказаць вялікі ўплыў на мастакоў, на мастацтва і навакольнае асяроддзе. У прыватнасці, на палітыку, эканоміку, развіццё нейкіх глабальных працэсаў. Як адзначае эксперт, «калі звернемся да вядомай усім формулы Дастаеўскага «свет уратуецца прыгажосцю», то філасофія творчасці дазваляе зразумець, як тое можа адбыцца. Унутрана ствараючы на аснове прыгажосці, мы маем патрэбу ў ёй, і атрымліваецца, што насычаем свядомасць прыгажосцю і пачынаем уносіць прыгажосць у навакольнае асяроддзе. Сучасны свет рухаецца па шляху, які быў пракладзены яшчэ філасофіяй Ніцшэ: свет барацьбы, у якім мала творчасці, канфліктны свет звышчалавека. Саярсіцкая філасофія можа аказаць вялікі ўплыў на далейшае развіццё цывілізацыі за кошт унясення прыгажосці ў свядомасць дзякуючы мастацтву. Становіцца магчыма фарміраванне новага свету і свету чалавека-творцы.

Мастак перакананы, што і ў кантэксце сучаснай папулярнай канцэпцыі шматпалярнага свету дадзеная філасофія актуальная, паколькі валодае фактарам, які аб'ядноўвае, бо «для творцы ў любой краіне зразумела, што такое творчасць, стваральная яе сіла...» Новы мастацкі кірунак сёння мае сваіх прыхільнікаў, а ў планах Сяргея Дождджа — зладзіць серыю выставак па гарадах Беларусі і за мяжой, выдаць кнігу для дзяцей па саярсізму.

А ў Расіі творчы падыход імкнуцца ўкараняць і ў навучальны працэс. Так, у Маскоўскім політэхнічным універсітэце ўжо шэсць гадоў рэалізоўваецца праект арт-кластара «АРТ ПАЛІТЭХ». Па словах яго куратара, мастака Валянціна Рабава, стварэнне такой прафесійнай інжынернай структуры «дае магчымасць фарміраваць у сучаснай моладзі новы творчы падыход у вырашэнні тэхналагічных і прамысловых задач, якія стаяць перад грамадствам і дзяржавай». Арганізатары праекта правялі ўжо некалькі дзясяткаў выставак.

**Алена ДРАПКО.**
**Фота з сайта НЦСМ.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 311 17 41.
E-mail: info@zviazda.by

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД № 38200000007667 ад 03.04.2004.
220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.
Тыраж 10.642.
Нумар падпісаны ў 19.30 05.06.2024 г.

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: 8 (0212) 24-63-12, 8 (029) 510-07-63.

**Продавец:** открытое акционерное общество «Завод «ЭВИСТОР», 210101, г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81, тел.: 8 (0212) 55-11-81, 8 (044) 5941732.

**Лот № 1.** Изолированное помещение с инв. № 200/D-196592 площадью 895,6 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81-14, наименование – производственное помещение, назначение – производственное помещение. Наличие мест общего пользования.

**Нач. цена: 133 507,23 бел. руб. без учета НДС. Задаток: 13 350,72 бел. руб.**

**Лот № 2.** Изолированное помещение с инв. № 200/D-196591 площадью 655,8 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81-39а, наименование – производственное помещение, назначение – производственное помещение. Наличие мест общего пользования.

**Нач. цена: 107 301,85 бел. руб. без учета НДС. Задаток: 10 730,18 бел. руб.**

**Лот № 3.** Изолированное помещение с инв. № 200/D-196590 площадью 843,7 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81-39, наименование – производственное помещение, назначение – производственное помещение. Наличие мест общего пользования.

**Нач. цена: 137 928,71 бел. руб. без учета НДС. Задаток: 13 792,87 бел. руб.**

**Дата, время и место проведения аукциона:** 08.07.2024 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: с 06.06.2024 с 08.30 по 05.07.2024 до 17.30. Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Задаток перечисляется на р/с ККУП «Витебский областной центр маркетинга» № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901. Условия аукциона:** Победитель аукциона (единственный участник аукциона, выразивший согласие на приобретение предмета аукциона по нач. цене, увеличенной на 5 %) обязан: в течение 10 раб. дней со дня проведения аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения на р/с, указанный в протоколе аукциона; подписать договор купли-продажи в течение 20 кал. дней со дня проведения аукциона; оплатить предмет аукциона в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи, оплатить НДС в размере 20 % сверх цены продажи предмета аукциона. По договоренности с Продавцом возможно предоставление рассрочки оплаты цены предмета аукциона. Расходы Продавца на подготовку документов (паспортизация, регистрация изолир. помещений): по лоту № 1 – 836,50 бел. руб. с учетом НДС, по лоту № 2 – 589,50 бел. руб., по лоту № 3 – 788,02 бел. руб. с учетом НДС. Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивид. предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивид. предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на бел. или русск. язык; представителем юр. лица РБ – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивид. предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на бел. или русск. язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Информация об окончательных суммах затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходах, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, письменно доводится до сведения участников до начала проведения аукциона. Доп. информацию можно получить по тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by. Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни по предварительному согласованию с Продавцом по тел.: +375 (33) 611 40 46 – Труханович Александр Владимирович.

# ДОПОЛНЕНИЯ И ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

по объекту: «Жилой комплекс с объектами социально-общественного назначения по ул. Тимирязева в г. Минске» 2-я очередь строительства, опубликованную в газете «Звязда» от 08.02.2024 № 27 (30161)

**Раздел «Информация об объекте строительства» дополнить пунктом 2.3.4.4. следующего содержания:**

«**2.3.4.4.** Гражданам, не состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридическим лицам и индивидуальным предпринимателям предлагаются для заключения договоров создания объектов долевого строительства в жилых домах по г. п. № 2.1 - 2.3 следующие объекты:

1) 11 квартир в жилом доме по г. п. № 2.1. Проектные номера квартир, общая площадь, стоимость строительства 1 кв. м общей площади:

Проектная квартира № 13, общая площадь 86,94 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 5800 белорусских рублей.

Проектная квартира № 14, общая площадь 82,6 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 5800 белорусских рублей.

Проектная квартира № 28, общая площадь 69,06 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 5900 белорусских рублей.

Проектная квартира № 34, общая площадь 69,06 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 6100 белорусских рублей.

Проектная квартира № 36, общая площадь 48,79 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 6500 белорусских рублей.

Проектная квартира № 42, общая площадь 48,79 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 6600 белорусских рублей.

Проектная квартира № 44, общая площадь 111,69 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 5900 белорусских рублей.

Проектная квартира № 52, общая площадь 69,07 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 5800 белорусских рублей.

Проектная квартира № 59, общая площадь 94,51 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 5700 белорусских рублей.

Проектная квартира № 63, общая площадь 68,98 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 6100 белорусских рублей.

Проектная квартира № 65, общая площадь 78,63 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 6100 белорусских рублей.

2) 14 квартир в жилом доме по г. п. № 2.2. Проектный номер квартиры, общая площадь, стоимость строительства 1 кв. м. общей площади:

Проектная квартира № 3, общая площадь 69,98 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 5800 белорусских рублей.

Проектная квартира № 12, общая площадь 94,51 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 5800 белорусских рублей.

Проектная квартира № 13, общая площадь 68,98 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 6100 белорусских рублей.

Проектная квартира № 14, общая площадь 67,97 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 6100 белорусских рублей.

Проектная квартира № 16, общая площадь 78,63 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 6400 белорусских рублей.

Проектная квартира № 18, общая площадь 68,98 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 6200 белорусских рублей.

Проектная квартира № 37, общая площадь 62,11 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 5900 белорусских рублей.

Проектная квартира № 38, общая площадь 111,69 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 5800 белорусских рублей.

Проектная квартира № 49, общая площадь 62,11 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 6200 белорусских рублей.

Проектная квартира № 61, общая площадь 95,17 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 5700 белорусских рублей.

Проектная квартира № 63, общая площадь 87,48 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 5700 белорусских рублей.

Проектная квартира № 67, общая площадь 114,7 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 5800 белорусских рублей.

Проектная квартира № 69, общая площадь 109,63 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 5800 белорусских рублей.

Проектная квартира № 70, общая площадь 110,72 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 5800 белорусских рублей.

3) 8 квартир в жилом доме по г. п. № 2.3. Проектный номер квартиры, общая площадь, стоимость строительства 1 кв. м. общей площади:

Проектная квартира № 8, общая площадь 93,34 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 6100 белорусских рублей.

Проектная квартира № 9, общая площадь 109,54 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 6200 белорусских рублей.

Проектная квартира № 25, общая площадь 112,91 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 6100 белорусских рублей.

Проектная квартира № 26, общая площадь 84,32 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 5900 белорусских рублей.

Проектная квартира № 35, общая площадь 108,19 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 7000 белорусских рублей.

Проектная квартира № 42, общая площадь 109,43 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 6200 белорусских рублей.

Проектная квартира № 43, общая площадь 59,58 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 6100 белорусских рублей.

Проектная квартира № 46, общая площадь 59,58 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 6200 белорусских рублей.

4) 4 машиноместа (парковочные места) в жилом доме по г. п. № 2.1. (проектные номера машиномест № 3, № 4, № 9, № 10) стоимость строительства машиноместа составляет 74100 белорусских рублей.

5) 4 машиноместа (парковочные места) в жилом доме по г. п. № 2.2. (проектные номера машиномест № 3, № 4, № 9, № 10) стоимость строительства машиноместа составляет 74100 белорусских рублей.

6) 11 кладовых в жилом доме по г. п. № 2.1. Проектные номера кладовых, общая площадь, стоимость строительства 1 кв. м общей площади:

Проектная кладовая № 14, общая площадь 8,09 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 3700 белорусских рублей.

Проектная кладовая № 15, общая площадь 9,96 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 3700 белорусских рублей.

Проектная кладовая № 26, общая площадь 12,39 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 3700 белорусских рублей.

Проектная кладовая № 27, общая площадь 6,03 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 3700 белорусских рублей.

Проектная кладовая № 28, общая площадь 8,59 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 3700 белорусских рублей.

Проектная кладовая № 29, общая площадь 12,1 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 3700 белорусских рублей.

Проектная кладовая № 39, общая площадь 12,15 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 3700 белорусских рублей.

Проектная кладовая № 40, общая площадь 11,71 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 3700 белорусских рублей.

Проектная кладовая № 41, общая площадь 11,96 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 3700 белорусских рублей.

Проектная кладовая № 42, общая площадь 5,09 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 3700 белорусских рублей.

Проектная кладовая № 43, общая площадь 14,3 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 3700 белорусских рублей.

7) 12 кладовых в жилом доме по г. п. № 2.2. Проектные номера кладовых, общая площадь, стоимость строительства 1 кв. м общей площади:

Проектная кладовая № 5, общая площадь 9,96 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 3700 белорусских рублей.

Проектная кладовая № 6, общая площадь 8,09 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 3700 белорусских рублей.

Проектная кладовая № 27, общая площадь 12,39 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 3700 белорусских рублей.

Проектная кладовая № 28, общая площадь 6,03 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 3700 белорусских рублей.

Проектная кладовая № 29, общая площадь 8,59 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 3700 белорусских рублей.

Проектная кладовая № 30, общая площадь 12,1 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 3700 белорусских рублей.

Проектная кладовая № 31, общая площадь 12,08 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 3700 белорусских рублей.

Проектная кладовая № 32, общая площадь 6,95 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 3700 белорусских рублей.

Проектная кладовая № 40, общая площадь 11,96 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 3700 белорусских рублей.

Проектная кладовая № 41, общая площадь 11,89 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 3700 белорусских рублей.

Проектная кладовая № 42, общая площадь 11,96 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 3700 белорусских рублей.

Проектная кладовая № 44, общая площадь 8,96 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 3700 белорусских рублей.

8) 1 административно-торговое помещение № 2 в жилом доме по г. п. № 2.1 (общей площадью 90,15 кв. метров). Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади предлагаемого административно-офисного помещения составляет 8200 белорусских рублей.

9) 1 административно-торговое помещение № 3 в жилом доме по г. п. № 2.3 (общей площадью 19,76 кв. метров). Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади предлагаемого административно-офисного помещения составляет 9400 белорусских рублей.

10) 3 магазина непродовольственных товаров в жилом доме по г. п. № 2.2. Проектные номера: № 3, № 4, № 5, общая площадь, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади:

Проектный магазин непродовольственных товаров № 3, общая площадь 41,66 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 8200 белорусских рублей.

Проектный магазин непродовольственных товаров № 4, общая площадь 47,84 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 8200 белорусских рублей.

Проектный магазин непродовольственных товаров № 5, общая площадь 47,84 кв. метров, стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 8200 белорусских рублей.

У застройщика действует система регулирования стоимости в зависимости от площади, этажа и условий оплаты строящегося жилого помещения, и иных факторов, влияющих на стоимость. По соглашению сторон, дольщику может быть предоставлена скидка от общей стоимости объекта долевого строительства».

**Раздел 5 проектной декларации изменить и изложить в новой редакции:**

«**5. Документы для заключения договоров будут приниматься с** 14.06.2024 года **по адресу:** г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 5, 4-й этаж, офис 13-10, **время работы:** понедельник-пятница в период времени с 10.00 по 19.00, без обеда, суббота и воскресенье – выходной.

Прием заявлений осуществляется до момента набора необходимого количества заявлений, соответствующего количеству продекларированных квартир. Если гражданин, желающий принять участие в долевом строительстве, в течение пяти календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу, и ООО «СЕТКО РЕЗИДЕНШЛ» оставляет за собой право заключить договор на заявленный объект долевого строительства с другим претендентом.

Ознакомиться с информацией об объекте долевого строительства и ходе работ по строительству можно по адресу:

Минск, пр-т Дзержинского, д. 5, 4-й этаж, офис 13-10, тел. +375 29 159 39 39.

Ознакомиться с планировками квартир можно на сайте https://olympicpark2.by.

Срок действия проектной декларации – до момента опубликования новой проектной декларации, которая отменяет действие опубликованной ранее».

УНП 192827731

# Дополнение к проектной декларации ООО «Датч Стар», опубликованной в газете «Звязда» 07.05.2024 г. по объекту

«Жилая застройка со встроенными помещениями общественного назначения в границах пр-та Дзержинского – ул. Щорса – ул. Папанина» (3-я очередь строительства)

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, в жилом доме № 4 (2 пусковой комплекс) предлагаются:

**6 (шесть)** однокомнатных квартир **площадью от 41 до 43 кв. м**, стоимость 1 кв. метра **от 4 554 до 5500 белорусских рублей**;

**3 (три)** однокомнатные квартиры **площадью от 54 до 63 кв. м**, стоимость 1 кв. метра **от 4 356 до 5 250 белорусских рублей** с обязательным условием приобретения не менее одного машино-места в объекте «Жилая застройка со встроенными помещениями общественного назначения в границах пр-та Дзержинского – ул. Щорса – ул. Папанина»;

**3 (три)** двухкомнатные квартиры **площадью от 67 до 101 кв. м,** расположенных на 2-18 этажах, стоимость 1 кв. метра **от 3 729 до 5 000 белорусских рублей** с обязательным условием приобретения не менее одного машино-места в объекте «Жилая застройка со встроенными помещениями общественного назначения в границах пр-та Дзержинского – ул. Щорса – ул. Папанина».

**Условия оплаты квартиры** – полная оплата цены договора в течение 3-7 календарных дней с момента регистрации договора долевого строительства в Комитете строительства и инвестиций Мингорисполкома.

Ознакомиться с планировками квартир можно по предварительной записи в офисе продаж «Гранд Авеню» по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 19, пом. 1567, по графику пн.-пт. с 9.00 до 18.00, сб, вс – выходной либо на сайте grandavenue.by.

Прием заявлений на заключение договоров создания объектов долевого строительства будет осуществляться в офисе продаж ЖК «Гранд Авеню» по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 19, пом. 1567.

УНП 191061436

# Информация о проведении

**21 июня 2024 года в 12.00** повторных аукционных торгов по продаже изолированного помещения,

**принадлежащего УП «Минское отделение Белорусской железной дороги»**

| | |
|---|---|
| **Сведения о предмете торгов** (наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества): изолированное помещение по адресу: г. Минск, ул. Авакяна, 28-61 с инв. номером 500/D-708127281, общей площадью 55,1 кв. м, наименование и назначение – помещение бытового обслуживания населения. Ограничения (обременения): аренда по 19.06.2024 г. | |
| **Начальная цена** – 142 000,00 бел. руб. | **Размер задатка** – 14 200,00 бел. руб. |
| **Продавец имущества –** УП «Минское отделение Белорусской железной дороги», 220030, г. Минск, ул. Свердлова, 28-1; Минская дистанция гражданских сооружений УП «Минское отделение Белорусской железной дороги», 220014, г. Минск, пер. Автодоровский, 11, тел.: (017) 225 22 25, (017) 225 57 89, (017) 225 38 12. **Организатор торгов –** государственное предприятие «МГЦН», 220030, г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10, тел.: (017) 365 48 36 | |
| **Срок и место приема заявлений: по 19.06.2024** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Порядок оформления участия в торгах и проведения аукциона изложен в извещении о проведении торгов, размещенном на интернет-сайтах: организатора торгов – www.mgcn.by (раздел «Аукционы/Недвижимость в собственность»); Минского городского исполнительного комитета – www.minsk.gov.by (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – www.gki.gov.by (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА»). **Телефон для справок** +375 (17) 365 48 36 | |

# ЗАО «БелБанкротАукцион»,

организатор торгов по продаже имущества учреждения «Купальня» (УНП 691510894), объявляет о проведении **08.07.2024 г. в 09.00** публичных торгов в электронной форме на электронной торговой площадке bankrottorg.by.

Перечень имущества и информация об условиях торгов размещены на сайте электронной торговой площадки: **bankrottorg.by.**

# Информационное сообщение о проведении конкурса по выбору землепользователя земельного участка

| | |
|---|---|
| Дата, время и место проведения аукциона | **27 июня 2024 года в 10.00**, Минская область, г. Березино, ул. Октябрьская, д. 39, Березинский сельский исполнительный комитет, зал заседаний |
| Предмет конкурса | Земельный участок для ведения личного подсобного хозяйства (код назначения – 1 02 00 – земельный участок для ведения личного подсобного хозяйства), расположенный по адресу: Минская область, Березинский район, Березинский сельсовет, д. Жорновка ориентировочной площадью 0,1500 га |

УНП 691343420

**Дополнительную информацию** по вопросам организации и проведения конкурса можно получить по телефонам: **+375(1715)68348, +375(29)6893864.** Извещение размещено на официальных сайтах: Минского областного исполнительного комитета (minsk-region.gov.by), Минского городского исполнительного комитета (minsk.gov.by), Березинского районного исполнительного комитета (berezino.gov.by) и Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь (gki.gov.by).

# ЗАО «БелБанкротАукцион»,

организатор торгов по продаже имущества КУП «Магазин № 3 г. Несвижа» (УНП 690298378), объявляет о проведении **08.07.2024 г. в 09.00** публичных торгов в электронной форме на электронной торговой площадке bankrottorg.by.

Перечень имущества и информация об условиях торгов размещены на сайте ЭТП: **bankrottorg.by.**

# «ВЕЧНЫ НОСЬБІТ МАСТАЦКІХ ТВОРАЎ — ПАПЕРА...»



**Завяршаецца падпісная кампанія на другое паўгоддзе 2024 года. Мы запыталі ў галоўнага рэдактара часопіса «Полымя» Віктара ШНІПА, чым яны вырашылі прывабіць чытача.**

***— Якім будзе па змесце часопіс «Полымя» ў другім паўгоддзі 2024 года? Якія найболей цікавыя творы з сучаснай прозы прапануеце чытачам?***

— Змест любога выдання залежыць ад тых твораў, якія напісаны і будуць напісаны сённяшнімі сучаснымі пісьменнікамі. Цяпер жа ні ў адно выданне сваіх новых апавяданняў, аповесцяў, раманаў не прапануюць ні Іван Шамякін, ні Уладзімір Караткевіч, ні Іван Мележ, ні Янка Брыль, ні Іван Пташнікаў, ні Міхась Стральцоў, ні Ян Скрыган... Але гэта не значыць, што нашы сучаснікі нічога значнага не напісалі і не напішуць. З цікавасцю чыталіся і мелі добрыя водгукі нядаўна надрукаваныя ў «Полымі» раманы Уладзіміра Гаўрыловіча «Любі бліжняга твайго...», Віктара Праўдзіна «Непераможны злом», Алеся Кажадуба «Партрэт», аповесці Зіновія Прыгодзіча «Чаромхавыя халады», Валянціны Кадзетавай «Ляліта з горада», Святланы Бязлепкінай «Півоненманія», Уладзіміра Васько «Горад пад вадой», апавяданні Алеся Бадака, Віктара Гардзея, Навума Гальпяровіча, Віктара Варанца... У другім паўгоддзі на старонках часопіса пабачаць свет першая частка новага рамана Уладзіміра Гніламёдава «У войску», алхімічна-філалагічны раман Людмілы Рублеўскай «Запавет Фаўста», апавяданні Алеся Бадака, Віктара Гардзея, Алены Брава, Алеся Ветаха, Івана Пяшко, працяг рамана «Божы дар» Георгія Марчука, які, на жаль, друкуецца ў раздзеле «Спадчына». Працягнем друкаваць успаміны Казіміра Камейшы «Па літфондаўскай пуцёўцы». На гэта раз будзе пра Кактэбель. Рыхтуюцца да друку дзённікі Вячаслава Адамчыка і Алеся Масарэнкі. Багаты ў нас партфель і на паэтычныя творы. У найбліжэйшы час можна будзе прачытаць вершы Міхася Башлакова, Алы Клемянок, Людмілы Кебіч, Іны Фраловай, Людмілы Воранавай, Галіны Бабарыкі, Сяргея Давідовіча, Ігара Пракаповіча...

***— Як часта ўдаецца адкрыць новыя імёны? Ці можна сцвярджаць, што аўтарскі актыў выдання за апошнія дзесяцігоддзі ўжо трывала сфарміраваны?***

— Новыя імёны, а гэта значыць, творы маладых літаратараў у першую чаргу адкрывае чытачам часопіс «Маладосць». Пасля ўжо некаторыя, найбольш смялейшыя з іх, самі прапануюць нам свае вершы і апавяданні. І гэта добра, што моладзь не баіцца «Полымя». У другім паўгоддзі ўпершыню ў часопісе будуць змешчаны апавяданні Паліны Корневай і Максіма Хацкевіча. Дзякуючы нашым пастаянным і ўжо добра вядомым аўтарам, мы не маем праблем, што друкаваць. У нас існуе нават пэўная «чарга». Але перш-наперш усё ж друкуецца самае таленавітае і цікавае, што не папсуе аўтарытэт часопісу.

***— Чаго не хапае вам як галоўнаму рэдактару з пункту гледжання тэматычнай прасторы мастацкіх твораў, што паступаюць у рэдакцыю? Напрыклад, як чытач я напружана чакаю, калі ж з'явіцца раман пра сучаснасць...***

— Тэматыка твораў, якая прапануецца нашымі аўтарамі для друку, вельмі разнастайная. Але, на жаль, пра сучаснасць мала хто піша. Мы друкавалі рамана Уладзіміра Гаўрыловіча. Гэтыя творы выйшлі асобнымі кнігамі — і Уладзімір Гаўрыловіч стаў лаўрэатам Нацыянальнай літаратурнай прэміі Рэспублікі Беларусь.




Гісторыя беларускай літаратуры не такая ўжо цяпер і маленькая, і, аналізуючы яе, мы бачым, што мала хто ў свой час пісаў удалыя творы пра сваю сучаснасць. І ўсё ж мы спадзяёмся, што творы пра герояў нашага часу будуць напісаны, калі не старэйшымі празаікамі, дык моладдзю, якая нарадзілася ўжо ў дваццаць першым стагоддзі. Мяркуючы па іх творах, што друкуюцца на старонках часопіса «Маладосць», відаць, што сярод моладзі ёсць таленты, якія ў недалёкай будучыні заявяць пра сябе вельмі ярка. Я на гэта спадзяюся.

***— Пра якія тэндэнцыі ў развіцці сучаснай беларускай паэзіі, зыходзячы з часопісных публікацый, можна весці гаворку?***

— Літаратурны працэс ніколі не стаяў на месцы. І, калі нават сучаснікі паўтаралі ў многім сваіх папярэднікаў, гэта ўсё роўна быў шлях, які трэба было прайсці. Як нельга з панядзелка пераскочыць у пятніцу, не пражыўшы аўторак, сераду і чацвер, гэтак жа нельга, пачаўшы з раманаў, напісаць класічны раман. Гэта датычыцца маладых празаікаў, якім я заўсёды казаў і цяпер паўтару, што трэба пачынаць з кароткіх апавяданняў.

На сёння адчуваецца пэўны застой у паэзіі. Рэдка з'яўляюцца яркія творы. Прадстаўнікі майго пакалення і старэйшыя, на жаль, мала пішуць. Ды і колькасна з-за ўзросту нас засталося не дужа шмат. Я ўжо не кажу пра тых, хто пачынаў свой шлях у літаратуру ў 60—70-я гады мінулага стагоддзя. З іх у працоўным творчым стане засталіся адзінкі. І цяпер часцей друкуюцца тыя, хто пачынаў гадоў сорак таму, але ўвесь гэты мінулы час быў у літаратурным працэсе на другім плане, а то і зусім, калі можна так сказаць, у абозе. І таму моладзь часам арыентуецца не на найлепшае. Гэта відаць па публікацыях. Многія з маладых пачынаюць з белых вершаў, з хоку. Я разумею, што так прасцей пісаць: не трэба шукаць рыфмы і сачыць за рытмам. І ўсё ж я веру, што ў нас у паэзіі, дзякуючы моладзі, з цягам часу з'явіцца шмат выдатных твораў, напісаных у класічным стылі. Моладзь у нас таленавітая.

***— Ці ўважлівыя крытыкі, літаратуразнаўцы да сучаснага літаратурна-мастацкага працэсу?***

— Цяпер самае слабае месца ў беларускай літаратуры — гэта крытыка і літаратуразнаўства. Раней, гадоў трыццаць таму, не трэба было па сто разоў прасіць крытыка, каб ён напісаў рэцэнзію на тую ці іншую новую кнігу. І пісьменнікі самі пісалі на сваіх калег па пяры. І пісалі востра і цікава. Цяпер, на жаль, усе, хто мае пэўныя літаратурныя здольнасці, жадаюць быць празаікамі і паэтамі. І ўсё ж крытыкі ў нас ёсць. І сярод іх чалавек пяць-сем — аўтарытэтныя. Шкада, што мала пішуць. Магчыма, і чытаюць сучасную літаратуру мала.

***— Ці сочыце за расійскімі літаратурна-мастацкімі перыядычнымі выданнямі? Што можна сказаць у частцы параўнанняў — і па зместу, і па тыражах?***

— Сачу. І бачу, што і ў расійскіх літаратурна-мастацкіх перыядычных выданнях такія ж праблемы, як і ў нас. Праўда, у іх большы выбар, каго друкаваць, а каго — не. І, калі параўнаць зместы іх часопісаў і тыражы з нашымі, то мы не прайграём. А ў некаторых напрамках мы наперадзе.

***— А ўвогуле — якой падтрымкі, увагі не хапае часопісу «Полымя»? Ці ёсць у вас зваротная сувязь з чытачом, падпісчыкамі?***

— Сувязь з падпісчыкамі ў нас ёсць. Прыемна, калі тэлефануюць чытачы і дзякуюць за творы, якія мы надрукавалі ў часопісе, а яны іх прачыталі і атрымалі задавальненне. Прыемна чуць парады. Праўда, на жаль, у большасці гэта чытачы, якія ўжо выпісваюць часопіс па сорак, а то і па пяцьдзясят гадоў. Маладыя падпісчыкі не тэлефануюць. Але, я ведаю, яны ёсць. Часам бывае вельмі крыўдна даведацца, што пісьменнік, якога мы толькі што надрукавалі, просіць знайсці яму для архіва асобнік «Полымя» з яго творамі. Пасля гэтага хочацца крычаць: «Які ж ты пісьменнік, калі чытаеш толькі сябе!» З такімі аўтарамі не хочацца мець справу.

Мы ў сваёй штодзённай працы маем плённае супрацоўніцтва з бібліятэкамі нашай краіны, з Саюзам пісьменнікаў Беларусі, з усімі абласнымі аддзяленнямі СПБ і з Мінскім гарадскім. І рэдкалегія ў «Полымя» працоўная, а не ганаровая. Вялікі ўсім дзякуй за разуменне і падтрымку. Спадзяёмся, што і надалей будзеце з намі на сувязі і будзеце не толькі чытаць «Полымя», але і выпісваць і прапагандаваць яго.

***— І такое амаль філасофскае пытанне... Наколькі доўгім вам падаецца век друкаваных, папяровых літаратурна-мастацкіх выданняў?***

— Часопіс «Полымя» выходзіць у свет ужо амаль 102 гады. І яго далейшае існаванне залежыць ад кожнага з нас. І ў першую чаргу ад саміх пісьменнікаў, а пасля ўжо ад чытачоў. Электронныя выданні не замянілі і ўжо ніколі не заменяць папяровыя. Яны будуць існаваць паралельна. Публічныя і хатнія бібліятэкі не могуць быць без папяровых кніг, часопісаў і газет. Самы вечны носьбіт для мастацкіх твораў і інфармацыі — гэта папера.

**Гутарыў Мікола БЕРЛЕЖ.**

Памяць

# Маштаб Асобы

**Выйшла кніга «Верыў у Беларусь», прысвечаная жыццю і дзейнасці дзяржаўнага дзеяча, мэра Мінска ў першай палове 1990-х гг., дыпламата і намесніка міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь Аляксандра Герасіменкі (1946—2017).**

Такія выданні з'яўляюцца нячаста. Гісторыкі, калі і персаніфікуюць мінулыя часіны, то найперш звяртаюцца да постацяў мінулых стагоддзяў альбо пішуць пра дзеячаў культуры і мастацтва, літаратуры, радзей — пра вучоных. Непасрэдныя арганізатары дзяржаўнага будаўніцтва, кіраўнікі Беларусі ў розныя дзесяцігоддзі, як правіла, застаюцца па-за ўвагай. І добра, калі яшчэ нехта з іх сам паспее напісаць успаміны, мемуары. А калі праходзіць час, паступова сыходзяць з жыцця людзі, якія ведалі таго ці іншага энергічнага, яркага кіраўніка горада ці вобласці, органа дзяржаўнага кіравання, застаюцца хіба што толькі дакументы, пракаментаваць якія аб'ектыўна не кожны і зможа.

Зборнік розных матэрыялаў «Верыў у Беларусь: Аляксандр Герасіменка» стаў прыемным выключэннем. Кніга выйшла ў выдавецтве «Тэхналогія». Укладальнік Сяргей Чыгрын разумна расклаў кнігу на тры асноўныя часткі — «Старонкі жыцця», «Успаміны», «Выбраныя гутаркі». Што цікава, у кнізе — падрабязны зварот да сям'і Аляксандра Міхайлавіча. Невялікі памерам раздзел — «Зямля талентаў» — расповед пра бацькоў галоўнага героя. Бацька мэра Міхаіл Майсеевіч Герасіменка (нарадзіўся ў 1918 годзе ў вёсцы Машава Чарнігаўскай вобласці ва Украіне) — беларускі партызан (у 24 гады начальнік шпіталя партызанскай брыгады імя Варашылава!), галоўны ўрач Уздзенскага раёна, заслужаны ўрач БССР, узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны І ступені, «Знак Пашаны», баявымі і працоўнымі медалямі. Марыя Апанасаўна Герасіменка — партызанская сувязная, разведчыца і падрыўніца (трапіла да партызан у 17 гадоў!), адзначана баявымі ордэнамі і медалямі. Пасля вайны — медсястра Уздзенскай раённай бальніцы. Агульны працоўны стаж медыкаў мужа і жонкі Герасіменкаў — каля 100 гадоў...

Партыйную, кіраўніцкую кар'еру Аляксандр Герасіменка праходзіў у няпростыя часіны развалу Савецкага Саюза, у тыя гады, калі рушыліся многія ідэалы камуністычнага, савецкага будаўніцтва. І пра гэта таксама расказваецца на старонках зборніка. Цікавай падаецца цытата з кнігі Андрэя Лукашэвіча «Градоправители» Минска. История власти (февраль 1917 — декабрь 2013)»: «Час кіраўніцтва райкамам партыі выпаў на перыяд «перабудовы» і галоснасці. Аляксандр Міхайлавіч як ніхто іншы адпавядаў патрабаванням часу. Паводле складу характару ён быў «дэмакратычны», умеў выслухаць чалавека, «просты ў гутарцы». І, самае галоўнае, умеў «згуртаваць калектыў, стварыць у ім здаровы маральна-псіхалагічны клімат». Пры гэтым ён заставаўся прынцыповым і патрабавальным». Аляксандр Міхайлавіч быў даволі кантактным кіраўніком, выходзіў да шырокай аўдыторыі у самых складаных абставінах.

У кнізе — мноства ўспамінаў сяброў па вучобе, па рабоце ў гарадзе, калег па дыпламатычнай працы. З цікавасцю чытаюцца «старонкі памяці» ад акадэміка Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктара тэхнічных навук Яўгена Маруковіча, намесніка Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Міхаіла Матусевіча, міністра інфармацыі і міністра культуры і друку Рэспублікі Беларусь Анатоля Бутэвіча... Вось што, у прыватнасці, згадвае Анатоль Іванавіч: «...прызнаюся, я не раз здзіўляўся, назіраючы за паводзінамі і дзейнасцю Аляксандра Міхайлавіча. Прызнаюся таксама, што многае з ягонага вопыту перахапіў і я. Шчырая праўда — падчас няпростых размоў і неабходнасці прымаць нейкія рашэнні я не раз стрымліваў сябе, перш чым нешта сказаць, пытаннем: а як павёў бы сябе ў гэтай сітуацыі Аляксандр Міхайлавіч? Не падманваю, так было не раз. Нават калі ён быў ужо на высокіх пасадах кіраўніка Мінгарвыканкама, намесніка міністра замежных спраў, Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Беларусь у Балгарыі і Грэцыі па сумяшчальніцтве, а пасля ў Латвіі. Вучыцца ніколі не позна. Асабліва ў такіх людзей, як Герасіменка». І яшчэ: «Згадваю нашы сустрэчы ў замежжы. Беларускі пасол рабіў усё магчымае і немагчымае, каб аб'яднаць вакол Беларусі як мага больш прыхільнікаў — як з ліку нашай дыяспары, так і ўсіх, хто мог бы стаць патрэбным у любой сферы. Яму гэта ўдавалася, і за гэта яго паважалі ў тых краінах, дзе ён прадстаўляў беларускі інтарэс. Да таго ж Герасіменка імкнуўся і ўмеў наладжваць жывыя кантакты паміж нашымі і замежнымі прадстаўнікамі прамысловасці, творчай інтэлігенцыі, навукі. А таму лічыў, што паслу трэба ведаць пра краіну знаходжання як мага больш, трэба пастаянна папаўняць гэтыя веды».

Сярод аўтараў кнігі «Верыў у Беларусь» — і Уладзімір Дражын («Ён адпавядаў часу»), Ігар Назарук («Я быў шчаслівы з ім працаваць»), Уладзімір Грыдзюшка («Яго абаяльная ўсмешка — заўсёды з намі»), Анатоль Зэкаў («Дзяржаўныя справы не дзеля славы»), Вячаслаў Качанаў («Ад фізікі да лірыкі») і інш.

Кніга пра шчырага і сумленнага службоўца багата ілюстравана. Выданне — і добры напамін пра тое, што дакументальная публіцыстыка такога характару патрэбна не толькі дзеля памяці пра канкрэтную асобу, а яшчэ і дзеля выхавання моладзі, наступнікаў у здзяйсненні тых вялікіх спраў, што рабілі папярэднікі. «Жыццё Аляксандра Міхайлавіча Герасіменкі — яркі прыклад служэння Радзіме і любімай справе. Ён быў не толькі граматным, таленавітым кіраўніком, але і чалавекам з актыўнай жыццёвай пазіцыяй, яго энергіі і сіле волі можна было толькі пазайздросціць» (Барыс Батура). І такіх сведчанняў і высокіх ацэнак у кнізе пра Аляксандра Міхайлавіча Герасіменку даволі шмат.

**Сяргей ШЫЧКО.**

# ФАБРЫКА СМЕРЦІ

## Навошта Літву напампоўваюць зброяй?

**Міністэрства эканомікі Літвы падпісала дагавор аб будаўніцтве ў краіне нямецкім абаронным канцэрнам Rheinmetall завода па вытворчасці боепрыпасаў. Пра гэта паведаміла ТАСС са спасылкай на літоўскае ведамства. «Прыход да нас Rheinmetall з'яўляецца важным крокам па забеспячэнні неадкладных патрэб Літвы ў сферы абароны і бяспекі, забеспячэнні неабходнымі боепрыпасамі», — прыводзяцца ў паведамленні словы міністра эканомікі і інавацый Аўшрынэ Арманайтэ. Падпісанне дагавора стала вынікам кансультацый і перагавораў, на якія спатрэбілася каля 10 месяцаў. Завод нямецкага канцэрна будзе вырабляць артылерыйскія снарады калібру 155 мм. Сцвярджаецца, што аб'ёмы вытворчасці складуць «дзясяткі тысяч боепрыпасаў за год». Будаўніцтва ваеннага завода праходзіць у агульным рэчышчы «германізацыі» прыбалтыйскай рэспублікі, бо нядаўна там яшчэ пачалося размяшчэнне сіл бундэсвера. Што ж адбываецца ў Літве?**




### БЕЗ ДАЗВОЛУ

Яшчэ ў пачатку красавіка міністр эканомікі і інавацый Літвы Аўшрынэ Арманайтэ анансавала, што Вільнюс падпіша кантракт з германскім канцэрнам Rheinmetall аб пабудове завода боепрыпасаў на тэрыторыі Літвы. «Актыўна працуем з прадстаўнікамі Rheinmetall. Спадзяёмся на тое, што пэўныя дамоўленасці будуць падпісаны», — сказала тады Арманайтэ. Паводле яе слоў, на гэтым заводзе плануецца вырабляць артылерыйскія снарады стандартнага для НАТА калібру 155 мм.

Крыху раней урад Літвы адобрыў папраўкі да заканадаўства, якія дазволяць буйным заходнім вытворцам зброі будаваць заводы на тэрыторыі рэспублікі, нагадаў iz.ru. У прыватнасці, літоўскае Мінэканомікі прапанавала ўстанавіць парадак, пры якім будаўніцтва буйных праектаў ваенна-прамысловага комплексу можна пачынаць і без адпаведнага папярэдняга дазволу з боку мясцовых самакіраванняў. Таксама мяркуецца дазволіць узвядзенне такіх заводаў без папярэдняй працэдуры тэрытарыяльнага ўзгаднення з муніцыпалітэтамі.

Інвестары не будуць абавязаны інфармаваць грамадскасць, дзе мяркуецца будаваць ваенныя заводы, запрашаць жыхароў да ўдзелу ў разглядзе праектных прапаноў і паведамляць ім аб пачатку будаўнічых работ. Наогул, вялікія інвестыцыі ў ваенную прамысловасць стануць прызнавацца «вельмі важнымі для бяспекі дзяржавы». І меркаванне насельніцтва ў разлік прымацца не будзе.

Кабінет міністраў звярнуўся да парламента з просьбай зацвердзіць гэтыя папраўкі ў тэрміновым парадку. Намеснік Арманайтэ Каралiс Жамойціс адзначыў: «Мы спадзяёмся, што праект вельмі важны — як з пункту гледжання нацыянальнай бяспекі, так і з пункту гледжання эканомікі». Пры гэтым чыноўнік заўважыў, што папраўкі рыхтуюцца спецыяльна для зручнасці Rheinmetall. Па яго словах, пакуль яшчэ нямецкі канцэрн не вызначыўся, дзе менавіта ў Літве можа быць пабудаваны яго завод. Напрыканцы сакавіка прэм'ер-міністр Літвы Інгрыда Шыманітэ паведаміла, што ў іх з немцамі ўзніклі рознагалоссі наконт гэтага прадпрыемства: хто і ў якім аб'ёме яго прафінансуе і дзе яно размесціцца.

### ВЯЛІКІ КУШ

Rheinmetall (яго штаб-кватэра знаходзіцца ў Дзюсельдорфе) цяпер самае паспяховае з нямецкіх прадпрыемстваў, канцэрн завалены замовамі. Так, паводле звестак галіновых колаў, кампаніі ваенна-прамысловага комплексу KMW і Rheinmetall падвоюць вытворчасць танкаў Leopard з цяперашніх 48 да прыкладна сотні адзінак у год. Таксама Rheinmetall са з'яўленнем новага вытворчага прадпрыемства ва Унтэрлюсе (Ніжняя Саксонія) і заводаў, запланаваных у Літве і ва Украіне, хоча нарасціць да 2027 года сваю вытворчасць снарадаў да 1,1 мільёна за год, паведаміла iz.ru.

Сёлетні план — 700 тысяч снарадаў. Боепрыпасы будуць пастаўляцца ў першую чаргу бундэсверу і саюзнікам па Германіі па НАТА — такім, напрыклад, як Нарвегія або Славакія, што зменшылі свае запасы з-за паставак ва Украіну, а таксама ўласна Кіеву. Зрэшты, па словах нямецкіх ваенных экспертаў, нават такіх пашыраных магутнасцяў будзе недастаткова для задавальнення ўсіх патрэб, асабліва ў артылерыйскіх снарадах, якія, з улікам патрэб Украіны, трэба вырабляць, па словах спецыялістаў, у колькасці не менш за 5,5 мільёна штук штогод.



У мінулым годзе Rheinmetall нарасціў выручку на 12 %, прыбытак — на 19 працэнтаў, пры гэтым абодва паказчыкі абнавілі рэкорды. Як зазначаецца ў прэс-рэлізе кампаніі, выручка ў мінулым годзе перавысіла 7,1 мільярда еўра, аперацыйны прыбытак — €918 млн. Партфель заказаў таксама ўстанавіў новы гістарычны максімум, павялічыўшыся на 44 працэнты (да €38,3 млрд). Чысты прыбытак узрос да €535 млн (у параўнанні з €474 млн годам раней).

Сёлета Rheinmetall чакае росту выручкі прыкладна да 10 мільярдаў еўра. «Пачалося новае дзесяцігоддзе ў гісторыі палітыкі ў сферы бяспекі. У гэтай сітуацыі мы ў Rheinmetall удзячныя за магчымасць унесці рашучы ўклад у аднаўленне абараназдольнасці нашай краіны. Мы не шкадуем сябе, каб выканаць гэтую задачу нацыянальнага значэння. Мы актыўна інвестуем, будуем новыя заводы і сур'ёзна пашыраем штат», — патэтычна заявіў кіраўнік кампаніі Армін Паппергер.

### «ГЕРМАНІЗАЦЫЯ» Ў ДЗЕЯННІ

Як адзначыла iz.ru доктар палітычных навук, прафесар Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага універсітэта Наталля Яроміна, Літва ў якасці галоўнага свайго знешнепалітычнага арыенціра ў рамках ЕС прыняла менавіта Германію. Гэта выяўляецца не толькі ў жаданні пабудаваць на сваёй тэрыторыі завод Rheinmetall. Летась у Літве захацелі купіць партыю нямецкіх танкаў «Леапард», што павінна было абысціся тамтэйшаму падаткаплацельшчыку ў два мільярды еўра. Аднак міністр абароны Лаўрынас Кашчунас паведаміў, што гэтая здзелка «завісла». Верагодна, праблема заключаецца ў тым, што ў Германіі няма «лішніх» танкаў, каб прадаць іх Вільнюсу. «Канчатковае рашэнне павінна быць прынята восенню ў залежнасці ад эканамічнай сітуацыі», — лічыць міністр абароны Літвы.

Затое ўвасабляецца таксама прыняты летась план размяшчэння на літоўскай тэрыторыі брыгады бундэсвера. 8 красавіка міністр абароны ФРГ Барыс Пісторыус адправіў у Літву першых 20 вайскоўцаў-добраахвотнікаў з настаўнарай брыгады «Літва». Адпраўляючы іх у аэрапорце Берліна, Пісторыус заявіў: «Вялікі дзень для брыгады, сёння ўпершыню яна становіцца бачнай. Важны дзень для бундэсвера. Адбываецца разгортванне падраздзялення за межамі Германіі, пачатак разгортвання. Гэта важны дзень і для НАТА, і для абараназдольнасці альянсу. Праз дзевяць месяцаў пасля прыняцця рашэння, праз тры месяцы пасля падпісання пагаднення паміж Літвой і Германіяй яны адпраўляюцца ў шлях, рыхтуюць дарогу для перадавога камандавання, для штаба, каб налета насамрэч пачаць фарміраванне брыгады».

Як нагадала Наталля Яроміна, гэта першы раз у пасляваеннай гісторыі Германіі, калі яна на пастаяннай аснове размяшчае свой вайсковы кантынгент у чужой краіне, і зусім невыпадкова гэтай дзяржавай стала менавіта Літва. «Што ж датычыцца будаўніцтва завода Rheinmetall у Літоўскай Рэспубліцы, то яго стварэнне ўкладваецца ў зацверджаны Еўрасаюзам план падтрымкі Украіны да 2027 года. Падобны праект сведчыць аб тым, што ў цяперашніх рэаліях лепш за ўсё сябе ў Еўрасаюзе адчуваюць лабісты ваенна-прамысловага комплексу, якія паступова перацягваюць у гэтую сферу ўсё больш фінансаў, — падкрэсліла эксперт. — Вядома, літоўская эканоміка мае вялікую патрэбу ў інвестыцыях. Аднак іх з імі цяпер там цяжка. І самы надзейны спосаб атрымання інвестыцый — прыцягнуць іх у ваенную сферу».

### ДЛЯ ЎЛАСНАЙ КІШЭНІ

У мінулым месяцы стала вядома, што Вільнюс актыўна вядзе перагаворы з ЗША (а як жа без іх) аб магчымасці вытворчасці боепрыпасаў амерыканскай кампаніяй Northrop Grumman на тэрыторыі Літвы. Пра гэта паведаміла ТАСС са спасылкай на заяву міністра абароны Лаўрынаса Касчунаса, які знаходзіўся з візітам у ЗША, літоўскаму тэлеканалу LNK. Касчунас адзначыў, што ў найбліжэйшыя тыдні плануецца падрыхтаваць пратакол аб намерах, пасля чаго прадстаўнікі Northrop Grumman прыедуць у Літву для ацэнкі сітуацыі на месцы. Паводле яго слоў, магчыма, амерыканскія партнёры не захочуць будаваць новы завод, а пажадаюць выкарыстоўваць ужо існуючае прадпрыемства пад Каўнасам. Завод пад Каўнасам, пабудаваны ў 2001 годзе з выкарыстаннем вытворчых ліній з Францыі за 63,8 млн еўра, ужо займаецца вытворчасцю боепрыпасаў, пераважна калібру 5,65 мм і 7,62 мм, якія ўваходзяць у боекамплект БМП арміі Літвы.

Літва актыўна закупляе ўзбраенне не толькі ў саюзнікаў па НАТА, але і ў іншых краін Захаду. Адбываецца гэта на фоне таго, што сацыяльныя выдаткі балтыйскай краіны не дазваляюць у належнай меры падтрымаць уласнае насельніцтва. Як адзначыў Baltnews старшыня Сацыялістычнага народнага фронту Гедрус Грабаўскас, урад Літвы не можа забяспечыць належны ўзровень сацыяльнай падтрымкі ў краіне. Замест таго каб накіраваць грошы на сацыяльную дапамогу, стварэнне працоўных месцаў і іншыя патрэбы, урад выдаткоўвае надмерна вялізныя сумы на ваенную сферу і выплаты датацый чыноўнікам. «Цэнтральная ўлада не прымае законаў, накіраваных на паляпшэнне сацыяльнага забеспячэння. А чаму? Вельмі вялікія сумы адпраўляюцца ў вайсковую сферу».

У сёлетнім бюджэце Літвы прадугледжаны рэкордныя асігнаванні на патрэбы абароны ў памеры 2,75 працэнта ад валавога ўнутранага прадукту. Летась гэты паказчык складаў 2,52 працэнта. З 2025 года выдаткі будуць складаць не менш як 3 працэнты ВУП. Налета адпаведныя асігнаванні павінны быць запланаваны ў памеры 2,38 мільярда еўра. У 2026 годзе іх плануецца давесці да 2,5 млрд еўра, у 2027-м — да 2,6 млрд еўра. У 2030 годзе Вільнюс мае намер павысіць абаронныя выдаткі да 2,84 млрд еўра.

Як растлумачыла Наталля Яроміна, цяпер, калі літоўская эканоміка ў крызісным становішчы, самым выгадным спосабам падзарабіць там лічыцца атрыманне ваенных падрадаў. «Каб іх займець, бізнес гатовы ўпотай сунуць грошы ў кішэню палітыкам і вайскоўцам. Тым, каго дапусцілі да гэтай кармушкі, выгадна нагнятанне мілітарысцкай істэрыі, якое назіраецца ў Літве, — заўважыла эксперт. — Аднак гэта не столькі прыкмета гатоўнасці да рэальных ваенных дзеянняў, колькі выкарыстанне сітуацыі для ўласнага ўзбагачэння».

Тым часам стала вядома, што жыхары Літвы выступілі супраць будаўніцтва завода па вытворчасці боепрыпасаў нямецкага абароннага канцэрна Rheinmetall. Аб гэтым паведаміла Baltnews. Па словах кіраўніка раёна Байсагала Рэнаты Масіўленэ, мясцовых жыхароў турбуе магчымы негатыўны ўплыў вытворчасці на эканоміку і экалогію рэгіёна. Кіраўнік раёна Байсагала Рэната Масіўленэ, дзе збіраюцца ўзвесці завод, заявіла, што адпаведныя навіны «як гром сярод яснага неба». Яна адзначае, што гэта ваеннае прадпрыемства, гэта непакоіць мясцовых жыхароў, якія пераважваюць за сельскую гаспадарку і эканоміку рэгіёна. Аднак цэнтральныя ўлады гэта не хвалюе. Яны (з карысцю для ўласнай кішэні) ахвотна віталі новых сябраў сваіх замежных «інвестараў».

**Пётр ДУНЬКО.**

---

**Даслоўна**

### «Літоўскія ўлады фінансуюць баевікоў для звяржэння законнай улады ў Беларусі»

Улады Літвы аказваюць падтрымку, у тым ліку фінансавую, каляваенным фарміраванням на яе тэрыторыі, якія ставяць за мэту звяржэнне законнай улады ў Беларусі. Аб гэтым у інтэрв'ю РІА «Новости» заявіў **міністр замежных спраў Беларусі Сяргей АЛЕЙНІК.**

«Інфармацыя, якой мы валодаем, якую мы давялі ў тым ліку па дыпламатычных каналах, сведчыць аб тым, што літоўскія ўлады не проста патураюць, яны фактычна падтрымліваюць і фінансуюць падрыхтоўку каляваенных фарміраванняў, якія ставяць за мэту звяржэнне законнай улады на тэрыторыі Беларусі і выкарыстанне тэрарыстычных, экстрэмісцкіх відаў дзейнасці ў адносінах да нашай краіны», — заявіў Сяргей Алейнік. Ён таксама дадаў, што Беларусь у курсе фактаў падрыхтоўкі і фінансавання такіх ваенізаваных фарміраванняў у Літве.

«Мы ніколі, гэта наша прынцыповая пазіцыя, не стваралі праблем суседзям. Не робім гэтага і цяпер. Беларусь — міралюбівая краіна, — заявіў Сяргей Алейнік па выніках сустрэчы ў Мінску з венгерскім калегам Петэрам Сіярта. — Нам дастаткова сваёй зямлі. Мы не збіраемся ні на кога нападаць. Але і сядзець склаўшы рукі мы таксама не будзем».

## Извещение о проведении электронных торгов

по продаже пустующего жилого дома в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 24.03.2021 г. № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами».

**Организатор электронных торгов**: Дукорский сельский исполнительный комитет, Минская обл., Пуховичский р-н, аг. Дукора, ул. Речная, 14, тел.: (801713) 63935, 31636, 8 (029) 2424313).

**Оператор электронной торговой площадки**: открытое акционерное общество «Белорусская универсальная товарная биржа»

**Электронный адрес электронной торговой площадки**: **www.et.butb.by**

Дата проведения электронных торгов: **8 июля 2024 года**

**Время проведения электронных торгов** устанавливается ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество»

| № п/п | Наименование | Адрес | Стоимость по рыночной оценке, рублей |
|---|---|---|---|
| 1 | Объект недвижимости: капитальное строение (пустующий жилой дом) | 222840; Республика Беларусь, Минская обл., Пуховичский р-н, д. Победа, ул. Полевая, д. 11 | 18 095,28 белорусских рублей (восемнадцать тысяч девяносто пять белорусских рублей 28 коп) |

Задаток для участия в электронных торгах перечисляется на текущий (расчетный) № BY60AKBB30120000066940000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минск, код AKBBBY2X, УНП 190542056, получатель платежа – ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа». **Срок внесения задатка** – до подачи заявления на участие в электронных торгах. Назначение платежа: внесение суммы задатка на участие в торгах. Окончание приема заявлений на участие в электронных торгах с прилагаемыми к ним документами по 02 июля 2024 года до 15.00.

Оплата стоимости предмета торгов осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. Осмотр предмета аукциона на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время либо с участием представителя организатора в рабочее время (понедельник– пятница, 8.30–13.00, 14.00–17.30).

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах размещен на сайте оператора .et.butb.by,

В течение десяти рабочих дней после утверждения протокола победитель электронных торгов (претендент на покупку) обязан:

возместить затраты за организацию и проведения электронных торгов, в том числе расходы, связанные с проведением оценки рыночной стоимости пустующего жилого дома;

внести плату за предмет аукциона;

подать в Дукорский сельисполком заявление о предоставлении земельного участка.

В течение 10 рабочих дней после совершения победителем электронных торгов (претендентом на покупку) указанных действий исполнительный комитет заключает с ним договор купли-продажи и передает ему копию решения суда о признании пустующего жилого дома бесхозяйным один экземпляр протокола

## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона

Лот: изолированное помещение с инвентарным номером 122/D-8489 (наименование: столовая; назначение: помещение общественного питания), площадью 1647,5 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Ивацевичский р-н, г. Ивацевичи, ул. 40 лет Октября, 3А-1

| **Начальная цена, руб. (с учетом НДС)** | 102 000,00 | **Размер задатка, руб.** | 10 200,00 |
|---|---|---|---|

**Продавец:** ОАО «Ивацевичиагротехсервис», 225295, Брестская обл., г. Ивацевичи, ул. 40 лет Октября, 3, тел./факс 80164592143. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000 в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. Срок заключения договора купли-продажи: до 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенного договора купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 20 июня 2024 г. в 14.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

**Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона www.ocenkabrest.by, а также можно узнать по телефонам: 8 (0162)-40-87-01, 40-87-02**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – 19 июня 2024 г. до 17.00**

## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении электронных торгов

| Предметы аукциона | Начальная цена, руб. (с учетом НДС) | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|
| Лот № 1: грузовой самосвал МАЗ 5551 А2, год выпуска 2008, регистрационный знак АВ 5644-1, кузов № Y3M5551A290001674 | 36 000,00 | 1 800,00 |
| Лот № 2: экскаватор цепной ДЗ-133 ЭЦ, год выпуска 2002, регистрационный знак АК-1 8514, заводской номер 0811 | 22 800,00 | 1 140,00 |

**Местонахождение:** г. Брест, ул. Я. Купалы, 108К.
**Организатор торгов, оператор электронной торговой площадки:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, т/ф 80162408701, gostorg.by.
**Продавец:** ОАО «Стройгаз, г. Брест», 224032, г. Брест, ул. Я. Купалы, 108К, т/ф 80162 34 04 76.
Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. Реквизиты для перечисления задатка: р/с BY32BAPB30127866600100000000 в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901.
**Условия продажи:** без условий.
**Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 5 календарных дней со дня проведения аукциона.
**Условия оплаты:** в течение 5 календарных дней со дня заключения договора.
**Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает вознаграждение Организатора торгов и фактические затраты на организацию и проведение электронных торгов.
**Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона.
**Шаг торгов:** 5 %

**Электронные торги состоятся 10 июля 2024 г. в 11.00**

**Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG». Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП**

**Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: 08.07.2024 до 16.00.**

## **РУП «Институт недвижимости и оценки»** (Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Авиакомпания Трансавиаэкспорт»** (Продавец)

**Электронные торги состоятся 24.07.2024.**

**Лот № 1:** самолет ИЛ-76МД EW-78769 (сер. № 6602) (без авиационных двигателей, без ВСУ, без оборудования специального назначения), инв. № 0798, заводской номер 0083487607. Начальная цена продажи без учета НДС – 1 500 000,00 долларов США. Задаток – 150 000,00 долларов США.

**Лот № 2:** авиационный двигатель Д-30КП-2 03053038902037, инв. № 0010. Начальная цена продажи без учета НДС – 255 000,00 долларов США. Задаток – 25 500,00 долларов США.

**Лот № 3:** авиационный двигатель Д-30КП-2 03053028502084, инв. № 0039. Начальная цена продажи без учета НДС – 220 000,00 долларов США. Задаток – 22 000,00 долларов США.

**Лот № 4:** авиационный двигатель Д-30КП-2 03053018902058, инв. № 1200. Начальная цена продажи без учета НДС – 285 000,00 долларов США. Задаток – 28 500,00 долларов США.

**Лот № 5:** авиационный двигатель Д-30КП-2 03053019002026, инвентарный номер 0033. Начальная цена продажи без учета НДС – 255 000,00 долларов США. Задаток – 25 500,00 долларов США.

Место нахождения лотов №№ 1–5: г. Минск, территория Национального аэропорта «Минск». Шаг электронных торгов – 5 %. Штраф – 10 % от начальной цены.

Срок для подписания договора купли-продажи: 10 (десять) календарных дней с даты утверждения протокола о результатах электронных торгов.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).

Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток на участие в торгах устанавливается в долларах США. Валюта платежа в счет перечисления задатка: для резидентов Республики Беларусь – белорусский рубль; для нерезидентов Республики Беларусь – российский рубль или белорусский рубль.

Расчетные счета для внесения задатков:

– в белорусских рублях: р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC банка BAPBBY2X;

– в российских рублях: р/с BY32BAPB30127802900200000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Список основных счетов «НОСТРО» ОАО «Белагропромбанк» размещен на ЭТП.

Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в электронных торгах 24.07.2024 (лот № __).

Срок внесения задатка: в рос. руб. – по 17.07.2024; в бел. руб. – по 19.07.2024 до 15.00.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами: 19.07.2024 в 16.00.

Организатор электронных торгов: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by

Электронный адрес ЭТП: gostorg.by

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению коммунального дочернего унитарного предприятия «Кинотехпром» (продавец), в лице председателя ликвидационной комиссии Саковича В. П., извещает о проведении 19 июня 2024 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 75 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, каб 2.9

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Условие продажи:** затраты по переоформлению документов на переход права собственности возлагаются на Покупателя | | | |
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 350/С-81185**, общей площадью **3 264,4** кв. м, назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **здание административно-хозяйственное. Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Федюнинского, 10.<br>**Капитальное строение с инв. № 350/С-167549**, общей площадью **7,7** кв. м, назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **здание административно-хозяйственное (проходная). Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Федюнинского, 10/2.<br>**Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340100000002006414** общей площадью **0,2036 га (право постоянного пользования). Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Федюнинского, 10.<br>**Капитальное строение с инв. № 350/С-190188**, общей площадью **0,0** кв. м, назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, наименование – **водопроводная сеть. Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, водопроводная сеть от ВК1 до зданий по ул. Федюнинского, 10. **Информация о земельном участке:** 340100000002006040 (присвоен предварительно).<br>**Капитальное строение с инв. № 350/С-167548**, общей площадью **0,0** кв. м, назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – **тепловая сеть. Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, тепловая сеть, от ТК-1 до здания по ул. Федюнинского, 10. **Информация о земельном участке:** 340100000002005572 (присвоен предварительно).<br>**Капитальное строение с инв. № 350/С-190467**, общей площадью **0,0** кв. м, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – **дождевая канализационная сеть. Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, дождевая канализационная сеть по ул. Федюнинского, 10. **Информация о земельном участке:** 340100000002006043 (присвоен предварительно).<br>**Капитальное строение с инв. № 350/С-190187**, общей площадью **0,0** кв. м, назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, наименование – **сеть канализации. Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, канализационная сеть от КК1 до КК7 по ул. Федюнинского, 10.<br>**Информация о земельном участке:** 340100000002006039 (присвоен предварительно). **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340100000002006412** общей площадью **0,1070 га (право постоянного пользования, доля в праве – 33/50). Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Федюнинского, 10.<br>**Также в состав лота № 1 входит:** сооружение – забор железобетонный (литер в, протяженность 52,8 м п.). Сооружение – забор железобетонный (литер и, протяженность 53,92 м п.). Сооружение – забор металлический (литер б, протяженность 13,1 м п.). Сооружение – ворота металлические с электроприводом (литер г, протяженность 8,9 м п., инв. № 255). Сооружение – ворота (литер д, протяженность 5,69 м п., инв. № 01361030). Сооружение – тротуар (литер ж, площадью 31 кв. м, инв. № 01361033). Сооружение – бордюры (литер к, протяженность 57,52 м п., инв. № 01361034). Сооружение – часть дворового покрытия инв. № 01361031 (площадью 1 124,0 кв. м). Обдирочно-заточной станок 3Б632, инв. № н/д. Лифт грузовой без проводника, г/п 1000 кг, зав. № 3508, 1979 год выпуска, инв. № н/д. Трансформатор трехфазный, зав. № 8657, тип ТМФ-250/10-75У1, мощность 250 кВА, напряжение 10/0,4 кВ, частота 50 Гц, масса 1300 кг, охлаждение – масляное, дата выпуска – 1984 г., дата ввода в эксплуатацию – декабрь 1984 г., инв. № н/д. трансформатор трехфазный, зав. № 81666, тип ТМ-250/10-75У1, мощность 250 кВА, напряжение 10/0,4 кВ, частота 50 Гц, масса 1420 кг, охлаждение – масляное, дата выпуска – 1972 г., дата ввода в эксплуатацию – декабрь 1984 г., инв. № н/д. Стеллаж комбинированный металлический № 1, размер 4,2х2,2х0,6 м, количество полок 6, инв. № н/д. Стеллаж комбинированный металлический № 2, размер 4,2х2,2х0,6 м, количество полок 6, инв. № н/д. Стеллаж комбинированный металлический № 3, размер 4,4х2,4х0,6 м, количество полок 6, инв. № н/д. Стеллаж комбинированный металлический № 4, размер 4,8х2,4х0,6 м, количество полок 6, инв. № н/д. Стеллаж комбинированный металлический № 5, размер 4,8х2,4х0,6 м, количество полок 6, инв. № н/д. Стеллаж комбинированный металлический № 6, размер 4,8х2,4х0,6 м, количество полок 6, инв. № н/д. Забор металлический (в разобранном виде) (литер а, протяженность 32,66 м п., инв. № 01361028), расчетная масса металла – 136 кг | 467 244,00 | 46 724,40 |

**Продавец:** коммунальное дочернее унитарное предприятие «Кинотехпром», 246007, г. Гомель, ул. Федюнинского, д. 10. Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. **8 (029) 647-81-95, Сакович Вадим Павлович. Шаг аукционных торгов –** 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. **Для участия в аукционе необходимо: 1).** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № 1 **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). 2).** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 6 июня 2024 г**. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 17 июня 2024 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того**, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату за услуги (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **15 (пятнадцати) рабочих дней** с момента подписания договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (в ред. постановления Совмина от 12.07.2013 № 607). **Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 27.07.2023 г. № 143 (30023). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-56, 8 (044) 599-18-16.**

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

**Гарох вырошчваюць сяўбой непасрэдна ў грунт. Замочанае на ноч насенне гароху да раніцы набрыняе, і яго густа сеюць у баразёнкі.**

# ДОБРЫ ЎРАДЖАЙ ГАРОХУ

Каб вырасціць большую колькасць гароху (ураджай можа павялічыцца да чатырох разоў) і расцягнуць перыяд плоданашэння, верхавіну прышчыпваюць, пасля чаго гарох пускае некалькі бакавых парасткаў.

Прышчыпванне можна праводзіць у любы момант, нават калі расліны яшчэ зусім маленькія. Лепш гэта рабіць раніцай сонечнага дня, каб ранка паспела падсохнуць і расліна не захварэла. Бакавыя парасткі гэтак жа можна з часам прышчыпнуць, і тады яны разгалінуюцца яшчэ мацней.



Чым больш у расліны ў выніку будзе сцёблаў, тым больш з гароху можна атрымаць ураджаю і тым пазней ён паспее.

Таму лагічна прышчыпваць палову ад усіх раслін, затым палову ад паловы, і гэтак далей, каб у выніку атрымаліся расліны з розным тэрмінам паспявання. Вырошчваць гарох неабходна на апорах або нацягнутых вяроўках, за якія ён будзе чапляцца падчас росту (інакш ляжа на зямлю, будзе горш расці, і збіраць яго будзе зусім нязручна). Для лепшага росту глебу пад гарохам неабходна рыхліць і выдаляць пустазелле.

Заўважана, што пры вырошчванні гароху ў ёмістасцях на наступны год ён дае большы ўраджай (гэта звязваюць з тым, што ў зямлі ствараецца папуляцыя неабходных для жыццядзейнасці гароху бактэрый).

Пасадка ў ёмістасці выгадная тым, што можна прарасціць гарох у памяшканні, а затым выставіць на вуліцу — гэта зберажэ яго ад знішчэння птушкамі, мышамі і мурашкамі, аднак за гарохам у ёмістасцях неабходна сачыць: палівадь, не допускаючы перасыхання зямлі.

## Чэрвеньскія падкормы кветніка



❍ Аднагадовыя кветкі ў пачатку лета падкарміце азотнымі ўгнаеннямі (мачавінай), каб лепш развіваліся парасткі і лісце. Затым для добрага цвіцення ўнясіце монафасфат калію.

❍ Шматгадовыя кветкі можна падкарміць наступным растворам. Развядзіце ў 15 літрах вады 1 л каравяку, 20 г аміячнай салетры, 15 г калійнай солі, 20 г суперфасфату і 250 г попелу. Паліце вашыя кветачкі звычайнай вадой і затым угнаеннем (дастаткова 1 літра на 1 расліну).

❍ Каб падрыхтаваць півоні да цвіцення на наступны год, можна падкарміць іх, нават калі яны ўжо адцвітаюць. На 1 кв. м спатрэбіцца 50—70 г азафоскі або нітрафоскі.

## Варта ведаць

✓ Лісце раслін можа змяніць колер і з-за недахопу ў глебе азоту — сцёблы станчаюцца, лісце драбнее і становіцца бледна-зялёным.

✓ Ад недахопу ў глебе фосфару лісты з ніжняга боку набываюць фіялетавае адценне, а калі расліны недаатрымліваюць калій, іх ніжняе лісце жоўкне з кончыкаў і закручваецца.

✓ На недахоп жалеза расліны рэагуюць з'яўленнем на лісці хларатычных плям, з-за недахопу магнію лісце набывае мармуровую расфарбоўку, а дэфіцыт бору выяўляецца ў адміранні пункту росту.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.40 | 21.37 | 16.57 |
| Віцебск — | 4.22 | 21.35 | 17.13 |
| Магілёў — | 4.30 | 21.27 | 16.57 |
| Гомель — | 4.36 | 21.14 | 16.38 |
| Гродна — | 4.57 | 21.50 | 16.53 |
| Брэст — | 5.07 | 21.42 | 16.35 |

## Месяц

*Маладзік у 15.37.*
*Месяц у сузор'і Блізнят.*

## Імяніны

**Пр.** *Івана, Мікіты, Сцяпана, Сямёна, Фёдара.*
**К.** *Марыі, Паўліны, Лаўрэнцыя, Нікіфара, Сямёна.*



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

# ЗАЎТРА




## 6 ЧЭРВЕНЯ — Даты — Падзеі — Людзі

У краіне

**1757** год — пажар знішчыў Віцебскі Ніжні замак, які пасля так і не аднавіўся.

**1841** год — нарадзілася пісьменніца Эліза Ажэшка. Эліза Ажэшка была вельмі папулярным тагачасным аўтарам, яе празаічныя творы інсцэніраваліся, перакладаліся на беларускую мову і на пачатку XX стагоддзя ставіліся на сцэнах многіх беларускіх гарадоў. Пры жыцці блізка сябравала з Францішкам Багушэвічам, які прысвяціў ёй верш «Яснавяльможнай пане Арэшчысе». Многія творы напісаны на тэмы грамадскай эмансіпацыі і барацьбы жанчын за свае правы. Шырокае прызнанне прынеслі раман «Над Нёманам», апавяданні з жыцця беларускіх сялян «Нізіны», «Дзюрдзі» і іншыя.



**1950** год — нарадзіўся (в. Кляны Дубровенскага раёна) Аляксей Дудараў, беларускі драматург. Дэбютаваў у друку ў 1973 годзе. Пісаў апавяданні, казкі для дзяцей. Вядомы як драматург і кінадраматург. Выдаў зборнікі апавяданняў «Святая птушка». Па сцэнарыях А. Дударава пастаўлены кароткаметражныя і мастацкія фільмы («Суседзі», «Белыя росы» і інш.). П'есы «Вечар», «Злом», «Апошні ўзлёт», «Радавыя» прысвечаны падзеям Вялікай Айчыннай вайны. Яго пяру належыць і трагедыя «Купала».

У свеце

**1599** год — нарадзіўся славуты іспанскі мастак Дыега Веласкес, вядучы мастак пры двары караля Філіпа IV і адзін з найбольш вядомых майстроў іспанскага Залатога веку. Вядомы як партрэтыст. У дадатак да мноства шматлікіх карцін, якія мелі вядомыя гістарычныя і культурныя сцэны, Веласкес стварыў дзясяткі партрэтаў іспанскай каралеўскай сям'і, іншых значных еўрапейскіх дзеячаў і простых людзей. Кульмінацыяй творчасці лічыцца яго шэдэўр «Меніны», адна з самых вядомых карцін у свеце.



**1799** год — нарадзіўся паэт, драматург і празаік Аляксандр Пушкін, стваральнік новай рускай літаратуры і сучаснай рускай літаратурнай мовы. Са шляхецкага роду Пушкіных. Камер-юнкер; член Расійскай акадэміі.

**1875** год — нарадзіўся Томас Ман, нямецкі пісьменнік, эсэіст, лаўрэат Нобелеўскай прэміі па літаратуры за 1929 год (за раман «Будэнброкі»). Лічыцца адным з галоўных прадстаўнікоў інтэлектуальнай рэалістычнай прозы XX стагоддзя. Аўтар раманаў «Прызнанні авантурыста Фелікса Круля», «Чароўная гара», «Доктар Фаўстус», апавяданняў «Трыстан», «Смерць у Венецыі», эсэ, крытычных твораў.

Так гаварыў...

**КАНФУЦЫЙ:**

*«За зло трэба плаціць па справядлівасці, а за дабро — дабром.*

## УСМІХНЕМСЯ

**Псіхіятру Кветачкіну калегі паставілі дыягназ шызафрэнія і змясцілі ў бальнічнае аддзяленне. Цёмнай ціхай ноччу Кветачкін выбраўся з палаты і паказаў няўдачлівым калегам розніцу паміж шызафрэніяй і маніякальным псіхозам!**

Быць бледным у сярэдзіне лета — высакародна. Адразу відаць, што ты блукаў ценістымі алеямі, аддаючыся думкам і непазбыўнай самоце, а не грэў пуза на сонейку, як жыццярадасны плебей. Ну, ці ў цябе няма дачы, водпуску, сяброў, ці ты саромеешся свайго выгляду ў купальніку. Але я настойваў бы на першым.

**Як ні стараўся фізрук танчыць на дыскатэцы, усё роўна атрымліваліся прысяданні.**



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 10.642. Індэкс 63850. Зак. № 1354.

Нумар падпісаны ў 19.30 5 чэрвеня 2024 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12